

КАЛІ ХОЧАЦЦА ПАДЗЯЛІЦЦА...

5

ЗАЛАТЫ ЗЯЦЬ «НЕСУЧАСНАЙ» БІЗНЕС-ЛЕДЗІ

11



Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

12 ЛЮТАГА 2022 г. СУБОТА № 29 (29651)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй ХМЕЛЬ, міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі:**

*«Намі ўжо падрыхтаваны прапановы, у тым ліку па тарыфнай палітыцы на 2023 год. На 2022 год тарыфная палітыка ўжо прынята. Безумоўна, будзем працаваць у рамках 5-доларавага калідора. Мы прымаем усе намаганні для таго, каб гэта ўтрымліваць, лічу, што, хоць і няпроста, але ўсе задачы вырашальныя. Для арганізацый ЖКГ, якія гэтыя паслугі аказваюць, ёсць такі мэтавы паказчык дзяржпраграмы, як стрымліванне росту затрат. Гэта цэлы комплекс арганізацыйных і тэхнічных мерапрыемстваў, якія дапамагаюць вытрымліваць трэнд, каб тарыфы не раслі. Магу запэўніць насельніцтва краіны ў тым, што рэзкага павышэння ўзроўню тарыфаў у краіне не чакаецца, усё будзе адбывацца планава, механізм празрысты і зразумелы для людзей. Тут нейкіх нараканняў ад насельніцтва і праблемных пытанняў няма».*

## КОРАТКА

- Замежныя інвестары ў 2021 годзе ўклалі ў рэальны сектар эканомікі Беларусі $8,7 млрд інвестыцый. Арганізацыі нашай краіны за 2021 год накіравалі за мяжу інвестыцый на суму $5,9 млрд.
- **У Беларусі расце колькасць шматдзетных сем'яў. За перыяд з 2009-га па 2019 год іх колькасць узрасла на 69 працэнтаў.**
- Арганізацыі Беларусі ў 2021 годзе паставілі на экспарт харчовых тавараў і сельскагаспадарчай сыравіны на суму $6,7 млрд, што склала 117,3 працэнта да ўзроўню 2020 года.

ISSN 1990 — 763X

# З НОВЫМ МОСТАМ!




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пазаўчора вечарам у сталіцы на славутай Нямізе быў адноўлены аўтамабільны рух (у тым ліку і пасажырскага транспарту) па мосце, які абрынуўся восьмага студзеня. Мостабудаўнікам і дарожнікам спатрэбіўся толькі месяц (яны ад пачатку паабяцалі ўкласціся ў гэты тэрмін), каб узвесці новы пуцеправод, які стаў шырэйшым на чатыры метры. Вырасла і яго апорная здольнасць у параўнанні са старым.

«Будаўніцтва пуцеправода было забяспечана ў адпаведнасці з усімі тэхнічнымі нормамі. Канструкцыя прайшла ўсе выпрабаванні, якія былі праведзены спецыялізаванымі арганізацыямі «БелдарНДІ», кафедры БНТУ мостабудавання. Яны далі вынікі, якія забяспечваюць надзейнасць канструкцыі нават пад двайной нагрузкай. На сёння можна з упэўненасцю сказаць, што работы па пуцеправодзе сапраўды былі праведзены ў самыя кароткія тэрміны. Выкарыстаны найноўшыя тэхналогіі і матэрыялы, якія далі магчымасць зрабіць пуцепровод больш сучасным і пашырыць вуліцы дарожнага руху. Зроблены ўсе неабходныя па вышыні памеры, якія адпавядаюць нарматывам для работы электратранспарту», — расказаў **старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ**.

Ён адзначыў, што пабудаваць мост у найкарацейшыя тэрміны ўдалося дзякуючы прафесіяналізму праектных і падрадных арганізацый. Работа вялася кругласутачна. «Абыякавых на аб'екце не было», — падкрэсліў старшыня Мінгарвыканкама.

### Сацыяльны ракурс

## ІНДЫКАТАР ДАВЕРУ

### Якія пытанні хвалююць работнікаў адукацыйнай галіны?

**У 2021 годзе ў арганізацыйныя структуры Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі паступіла больш за 2,5 тысячы зваротаў. На асабістым прыёме былі прынятыя 5,2 тысячы чалавек. Яшчэ 9 тысяч чалавек атрымалі кансультацыі па пытаннях, якія іх цікавілі. Па выніках разгляду зваротаў былі адменены загады аб накладанні на работніка Каладзішчанскай школы дысцыплінарных спагнанняў, адноўлены на працы пасля разгляду працоўнай спрэчкі ў судзе два настаўнікі з Пінкавіцкай сярэдняй школы. Маладым спецыялістам з гімназіі горада Чэрвеня былі выдзелены месцы ў інтэрнатах. Па просьбе членаў прафсаюза было падрыхтавана 20 працэсуальных дакументаў. Пяць іскавых заяў, складзеных з удзелам прафсаюза, разгледжаны на карысць работнікаў, і 23 працоўныя спрэчкі вырашыліся без звароту ў суд.**

**Пра гэтыя і іншыя факты паведаміла на IV пленуме Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі яго старшыня Таццяна ЯКУБОВІЧ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СТАР. 6

### Спартыўная змена

## «СНЕЖНЫ СНАЙПЕР» ТРАПІЎ У ЦЭЛЬ

**Пакуль у алімпійскім Пекіне беларускія біятланісты выступаюць на галоўным старце чатырохгоддзя, у Раўбічах на сваім галоўным старце выступае іх будучая змена. Рэспубліканскія спаборніцтвы сярод дзяцей і падлеткаў па біятлоне «Снежны снайпер» на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба даўно сталі кузняй біятлонных талентаў. Менавіта з гэтага турніру пачыналі сваю кар'еру многія вядомыя беларускія біятланісты. Прычым пуцёўку ў спорт турнір дае не толькі тым, хто хоча быць страляючым лыжнікам.**



## МАМА, ТАТА, МЫ...

Лёгкая атлетыка, лыжныя гонкі, сучаснае пяцібор'е, плаванне, фехтаванне — віды спорту, папулярныя ў сям'і Гнедчык. Дзеці Марыя, Акім і Клім разам з мамай Аксанай паспрабавалі іх усе. Але пачалося менавіта са «Снежнага снайпера».

«Наша сям'я ніколі не была звязаная ні з лыжамі, ні з біятлонам. Займацца гэтымі відамі спорту мы не планавалі.

СТАР. 12

З першых вуснаў

# «Ад суда чакаюць выверaных, справядлівых і законных прававых рашэнняў»

**Прэзідэнт Беларусі правёў нараду, дзе абмеркавалі праект закона «Аб змяненні Крымінальна-працэсуальнага кодэкса». Навацыямі прадугледжваецца аптымізацыя перагляду судовых рашэнняў і прапаноўваецца ўвядзенне дадатковай стадыі судаводства — касацыйнай.**

«Эфектыўнасці работы судовай сістэмы ў нашай краіне заўсёды ўдзялялася павышаная ўвага. Тэма сённяшняй нашай размовы — судовае пасяджэнне. Асабліва па крымінальных справах», — акрэсліў нагоду сустрэчы Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, у краіне існуе сістэма абскарджання рашэнняў суда, але пэўны час таму вырашылі яе ўдасканаліць на карысць людзям. У суд у канчатковым выніку можа звярнуцца кожны па абарону сваіх парушаных правоў, працягнуў Прэзідэнт.

«***Менавіта ад суда чакаюць выверaных, справядлівых і законных прававых рашэнняў. Крымінальнае судаводства тут на асаблівым рахунку. Сур'ёзнасць пытанняў, якія разглядаюцца, і наступстваў судовых пастаноў патрабуе вельмі ўзважанага падыходу да рэфармавання гэтай сферы***. Тым больш калі справа датычыцца такога адчувальнага для людзей моманту, як абскарджанне рашэнняў суда», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

На жаль, заўважыў ён, нават самы адукаваны і дасведчаны суддзя або пракурор у сваёй працы не застрахаваны ад памылак, і не толькі дробных, тэхнічных. «Часам яны могуць прывесці і да асуджэння невінаватага. Магчымасць выправіць такія памылкі павінна быць безумоўна гарантаваная», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Для гэтага ў 2016 годзе судовая сістэма перайшла ў крымінальным працэсе ад касацыйнага да апеляцыйнага парадку абскарджання, які дазваляе больш поўна даследаваць акалічнасці справы ў судзе другой інстанцыі. У 2019 годзе Прэзідэнт даручыў Вярхоўнаму Суду ўнесці прапановы аб далейшым удасканаленні парадку абскарджання судовых пастаноў па крымінальных справах.

«Калі чалавек незадаволены, ён мае права звярнуцца са скаргай. І ў 2019 годзе мы вырашылі, што ўдасканалім гэты парадак. У канцы мінулага года Вярхоўны Суд прадставіў адпаведны праект закона. З аднаго боку, гэты праект прадугледжвае аптымізацыю існуючага парадку перагляду судовых рашэнняў, каб не было валакіты, бюракратыі і заарганізаванасці, а было без залішніх інстанцый. З іншага боку, у гэтым праекце закона прапаноўваецца ўвесці дадатковую стадыю судаводства — касацыйную», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён папрасіў распрацоўшчыкаў і зацікаўленых дакладна растлумачыць: для чаго патрэбна вяртанне ў Крымінальны працэс касацыі, бо і апеляцыйная вытворчасць захоўваецца.

Заўважыў Прэзідэнт, што абгрунтаваць сутнасць новаўвядзенняў неабходна і грамадзянам, і нагадаў: у яго прафесійным жыцці быў этап, калі працаваў на адным прадпрыемстве з асуджанымі. Па словах Прэзідэнта, кожны з іх запэўніваў у асабістых размовах, што невінаваты.

«З тых часоў у мяне засталося пачуццё сумленнасці. Ёсць сярод такіх і суперталенавітыя людзі, якія ўсё могуць рабіць, але трапілі туды. А можа, сапраўды, дапускалі памылкі (суды. — «**Зв.**») тады і цяпер? ***Таму для людзей такіх і іх родных вельмі важна, каб судаводства наша было як мага больш сумленным***», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

На нарадзе Прэзідэнт папрасіў патлумачыць таксама, у чым будуць заключацца ключавыя адрозненні паміж апеляцыяй і касацыяй і як новаўвядзенні паўплываюць на эканамічнасць і аператыўнасць правасуддзя.

«***Неабходна не забюракратызаваць правасуддзе***. І, канешне, не павінна быць падаражэння. Акрамя таго, паводле прадстаўленых матэрыялаў, зацікаўленыя органы не выказалі заўваг па праекце закона. Усе згадзіліся. Але ці ўсё ў гэтым праекце закона так бездакорна? Калі ж мы ідзём на змены заканадаўства, неабходна зрабіць яго найбольш аптымальным», — акцэнтаваў кіраўнік дзяржавы.

Ён настроіў на сумленнае і шчырае абмеркаванне праекта закона: ці ёсць там падводныя камяні, ці ўсё ўлічана, ці сапраўды праект гатовы да разгляду ў парламенце.

«Ну, і самае галоўнае — у чым карысць гэтага праекта не толькі для праваахоўнай і судовай сістэм, але, галоўнае, і для грамадзян?» — задаў пытанне Прэзідэнт.

Адказваў на яго галоўны распрацоўшчык праекта закона «Аб змяненні Крымінальна-працэсуальнага кодэкса» Старшыня Вярхоўнага Суда Валянцін Сукала.

Ён расказаў, што структурна законапраект складаецца з дзвюх частак. Першая — завяршэнне ўвядзення апеляцыі ў суды ўсіх узроўняў, другая — увядзенне новых інстытутаў судаводства і атрыманне наступных стадый (судовага нагляду).

Старшыня Вярхоўнага Суда заўважыў, што апошнія дзесяць гадоў паслядоўна і ўважліва ўводзілі ў крымінальнае судаводства інстытут апеляцыі. «Інстытут апеляцыі — гэта праверка законнасці судовых рашэнняў, якія не ўступілі ў законную сілу. Як правіла, у такім рэжыме ў нас абскарджваецца кожны пяты прысуд, але 80 % прысудаў застаецца фактычна па-за полем увагі апеляцыйнай праверкі. Для гэтага патрабуюцца наступныя стадыі праверкі законнасці прысудаў, якія ўжо ўступілі ў сілу», — сказаў ён.

Валянцін Сукала патлумачыў адрозненні апеляцыі і касацыі. То-бок апеляцыя правярае законнасць прысудаў, якія не ўступілі ў законную сілу, а касацыя правярае судовае рашэнне, якое ўжо ўступіла ў законную сілу.

Па словах Валянціна Сукалы, апеляцыйны парадак прадугледжвае шырокія магчымасці для суда карэкціраваць рашэнні, якія яшчэ не ўступілі ў сілу, без накіравання іх на новы разгляд.

«У гэтым прынцыповае адрозненне. І нам за гэты перыяд часу ўжо ўдалося максімальна скараціць колькасць паўторных судовых пасяджэнняў. З 7500 спраў, што разглядалі ў апеляцыйным парадку ў мінулым годзе, на новы судовы разгляд у раённыя суды было накіравана толькі 45», — прывёў лічбы Валянцін Сукала.

Ён дадаў, што інстытут апеляцыі міркуюць распаўсюдзіць і на рашэнні Вярхоўнага Суда, якія да гэтага часу лічацца канчатковымі і не падпадаюць пад абскарджанне. Першая частка законапраекта, які абмяркоўваецца, якраз і дае такую магчымасць. Для гэтага ў Вярхоўным Судзе створаць адпаведную інстанцыю.

Прэзідэнт у дыялогу з распрацоўшчыкам заўважыў: па сутнасці атрымаецца, што Вярхоўны Суд будзе правяраць свае ж прысуды?

Валянцін Сукала патлумачыў, што будзе створана адмысловая калегія для разгляду апеляцыйных спраў з найбольш вопытных суддзяў, членаў Прэзідыума Вярхоўнага Суда.

«Людзі кажуць: рука руку мые», — акцэнтаваў у адказ кіраўнік краіны.

«Іншай структуры пры наяўнасці кампетэнцый Вярхоўнага Суда прадугледзіць немагчыма. Яе няма. Таму гэта структура найбольш эфектыўная. Такая сістэма ў пяці краін СНД», — сказаў Старшыня Вярхоўнага Суда.

Прэзідэнт запытаўся, ці магчыма нешта прыдумаць, каб апеляцыі на рашэнні Вярхоўнага Суда разглядалі іншыя суды.

Па словах Валянціна Сукалы, выхад адзін — пазбавіць Вярхоўны Суд кампетэнцыі разгляду спраў па першай інстанцыі па прыкладзе Расійскай Федэрацыі і зрабіць яго толькі апеляцыйнай інстанцыяй для ўсіх іншых судоў.

Ужо ў размове з журналістамі Валянцін Сукала звярнуў увагу, што доўга абмяркоўвалася навацыя наконт абскарджання рашэнняў Вярхоўнага Суда ў апеляцыйным парадку. Для гэтага ў Вярхоўным Судзе меркавалі стварыць адпаведную інстанцыю з найбольш прафесійных суддзяў.

«Вось тут узнікла дыскусія, якой павінна быць структура гэтага судовага органа, які можа пераглядаць рашэнні самога Вярхоўнага Суда ў апеляцыйным парадку. У дыскусіі казалі, што неабходна пашырыць склад гэтай калегіі, увесці туды прадстаўнікоў грамадскасці», — расказаў журналістам Валянцін Сукала.

У цэлым кіраўнік дзяржавы праект ухваліў, і пасля дапрацоўкі ён будзе прадстаўлены ў парламент.

Другая частка законапраекта, расказаў Старшыня Вярхоўнага Суда, накіравана на ўдасканаленне наступных стадый судаводства — касацыі і нагляду.

«На гэтых дзвюх стадыях правяраюцца прысуды, што ўступілі ў законную сілу і выконваюцца праз працяглы час. Тут неабходна адаптаваць наша нацыянальнае заканадаўства да працэдур, што існуюць на постсавецкай прасторы. Праект прадугледжвае скарачэнне наглядных інстанцый з чатырох да дзвюх. Сама працэдура праверкі будзе больш яснай і сучаснай», — паведаміў Валянцін Сукала.

Як дадаў генеральны пракурор Андрэй Швед, важнае патрабаванне Прэзідэнта на выніках нарады — уключэнне грамадзян у ажыццяўленне правасуддзя. Генеральная пракуратура, Вярхоўны Суд будуць думаць, як магчыма прыцягнуць грамадства да ацэнкі судовых рашэнняў. Размова ідзе аб узмацненні інстытута народных засядацеляў і прапрацоўцы механізму, каб і ў апеляцыйным працэсе з'явіліся такія людзі. Іх удзел у працэсе будзе падкрэсліваць сумленнасць правасуддзя.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Рэферэндум

# АДДАЦЬ СВОЙ ГОЛАС ЗА БУДУЧЫНЮ КРАІНЫ

**Беларусь уступае ў адказную фазу электаральнай кампаніі, якая суправаджаецца актыўнай падрыхтоўкай участкаў для галасавання, складаннем адпаведных спісаў, работай з насельніцтвам па тлумачэнні важнасці ўдзелу ў рэферэндуме непасрэдна або ў датэрміновым галасаванні. Правядзенне семінараў-нарад — адзін са складнікаў гэтай работы. Учора ў прадстаўнікоў выканаўчай улады, кіраўніцтва тэрытарыяльных участковых камісій Магілёўскай вобласці была магчымасць задаць пытанні непасрэдна кіраўніку Адміністрацыі Прэзідэнта Ігару Сергеенку, міністру ўнутраных спраў Івану Кубракову, старшыні Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Ігару Карпенку. Сустрэча прайшла пад кіраўніцтвам старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоля Ісачанкі.**



Фота БелТА.

Губернатар паведаміў, што ў вобласці створаны ўсе ўмовы для правядзення кампаніі. Акрамя абласной камісіі, на Магілёўшчыне створана яшчэ 25 раённых. У абласныя і раённыя камісіі акрэдытавана болей чым 163 назіральнікі. Сфарміравана таксама 707 участковых камісій, у склад якіх увайшло болей чым 7 тысяч чалавек. У якасці назіральнікаў акрэдытавана болей чым 3,5 тысячы чалавек.

Ігар Карпенка агучыў у цэлым сітуацыю па краіне.

— Усяго створаны 153 тэрытарыяльныя камісіі і 5510 участковых, — паведаміў ён. — Распрацаваны метадычныя рэкамендацыі для ўсіх узроўняў камісій, прыняты адпаведныя пастановы і тлумачэнні.

Ён звярнуў увагу на тое, што электаральная кампанія — гэта частка дзяржаўна-дэмакратычнага працэсу і грамадзяне павінны адчуваць адказнасць за ўдзел у такіх мерапрыемствах.

— Гэта і ёсць тая прамая дэмакратыя, якая дазваляе ўлічваць голас кожнага, — падкрэсліў ён. — Кожны чалавек павінен свядома зрабіць свой выбар. Кіраўнік дзяржавы якраз разлічвае на поўнае разуменне таго, як людзі ўспрымаюць магчымыя змяненні ў Канстытуцыю і тыя пасылы, якія трэба закласці ў заканадаўства па выніках гэтага рэферэндуму.

Цікавасць да падзеі вельмі высокая, звярнуў увагу падчас свайго выступлення кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка.

— Рэферэндум стане вянцом усёй той маштабнай работы, якая праводзілася ў краіне практычна на працягу года, пачынаючы ад стварэння Канстытуцыйнай камісіі, яе работы па прапановах, якія агучваліся ў розных аўдыторыях, падчас сустрэч з працоўнымі калектывамі, дапрацоўкі праекта Канстытуцыі сумесна з рабочай групай, далейшым этапам усенароднага абмеркавання, падчас якога паступіла 10 тысяч прапаноў, — рэзюмаваў выступоўца. — Частка іх была ўключана ў Асноўны Закон, частка знойдзе адлюстраванне ў далейшых законах. Сёння вядзецца работа ў калектывах, накіраваная на растлумачванне змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю. Заклікаем народ прыняць удзел у рэферэндуме і аддаць свой голас за будучыню краіны.

Міністр унутраных спраў Іван Кубракоў у сваю чаргу паведаміў, што арганізацыя бяспекі парадку на тэрытарыяльных участках у надзейных руках. Прааналізаваны негатыўны вопыт папярэдняй электаральнай кампаніі і выпрацаваны алгарытм дзеянняў у кожным асобным выпадку. На ўсіх выбарчых участках будуць дзяжурыць супрацоўнікі міліцыі, на выпадак правакацый у баявой гатоўнасці знаходзяцца групы спецыяльнага рэагавання. Для членаў камісіі, якія будуць выязджаць на дом да хворых і тых, хто не зможа прыйсці на ўчасткі, будзе арганізавана спецыяльнае суправаджэнне. Іван Кубракоў звярнуў увагу, што ўсе гэтыя меры прымаюцца на ўсялякі выпадак. Сёння абстаноўка спакойная і няма ніякіх пагроз для зрыву адказнага мерапрыемства.

Падчас нарады было растлумачана, як будзе арганізавана галасаванне для хворых на ковід, якім чынам будуць галасаваць уладальнікі біяметрычных пашпартоў, разгледжаны іншыя пытанні, звязаныя з арганізацыяй правядзення рэферэндуму.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# «КАЛГАС — ГЭТА ЛЮДЗІ. ЛЕПЕЙ І НЕ СКАЖАШ»

## Сацыяльная адказнасць — не словы, а справы

*Амаль чвэрць стагоддзя ў ААТ «Відамлянскае» яго дырэктар Міхаіл СТРАПКО вырашае не толькі вытворчыя задачы, але і плённа працуе на развіццё аграгарадка*

**Вось такім жа лютаўскім днём у самым канцы мінулага стагоддзя выбіралі вяскоўцы новага старшыню ў зусім не перадавым калгасе «Кастрычнік» Камянецкага раёна. Прагаласавалі, хоць і не асабліва, можа, верылі, што гэты прэтэндэнт карэнным чынам памяняе гаспадарку, зробіць яе адной з найлепшых не толькі ў раёне, але і ў вобласці. І не адны вытворчыя паказчыкі заўсёды будуць цікавіць кіраўніка гаспадаркі, знешні выгляд Відамлі стане зусім іншым, аб'екты сацыяльна-культурнага прызначэння набудуць новыя форму і змест. Гэта нібы пра яго запісана ў артыкуле 21 праекта Канстытуцыі, дзе гаворыцца пра сацыяльную адказнасць, работу на карысць развіцця дзяржавы і грамадства.**



Міхаіл СТРАПКО.

### НА ПЕРАДАВЫЯ ПАЗІЦЫІ

Родам Міхаіл Мікалаевіч з вёскі Дуброўка Драгічынскага раёна. Сям'я ў бацькоў была шматдзетнай, усіх выхоўвалі ў пашане да працы. Хоць з маладосці спрабаваў сябе на розных гарадскіх работах, але пасля службы ў арміі вырашыў паступаць у Беларускую дзяржаўную сельгасакадэмію ў Горках. Як адзін з найлепшых у сваім выпуску атрымаў накіраванне ў легендарны тады калгас «Савецкая Беларусь» Камянецкага раёна, якім кіраваў Уладзімір Бядуля. Працаваў па спецыяльнасці аграномам, даволі працяглы час узначальваў прафкам гаспадаркі, затым займаў пасаду намесніка ў Бядулі.

Потым яму прапанавалі ўзначаліць калгас «Кастрычнік», у склад якога ўваходзіла тады восем вёсак. Гэта быў самы канец 90-х. Тэхніка ў гаспадарцы была спрэс старая, абсталяванне не лепшае, на першай пасяўной нават паліва не хапала, выкручваліся як маглі. Найперш узяліся за рэканструкцыю фермаў. Пачалі вывозіць больш арганікі на палі, пайшла ўверх ураджайнасць. Адначасова старшыня стаў падбіраць спецыялістаў, фарміраваць сваю каманду. Дадому прыязджаў за поўнач, а ў шэсць раніцы ўжо праводзіў ранішнюю нараду. Адным словам, за некалькі гадоў ураджайнасць збожжавых у гаспадарцы ўдалося павялічыць з 20 да 35 цэнтнераў. Істотна вырасла пагалоўе буйной рагатай жывёлы, абнавілі тэхнічны парк. Да гаспадаркі далучылі частку занядбанага калгаса «Радзіма», затым яшчэ аднаго, сталі падцягваць і тыя землі ды вытворчыя аб'екты. Пазней, калі гаспадарка ўжо стала называцца «Відамлянскае», да яе далучылі яшчэ некалькі нерэнтабельных сельгаспрадпрыемстваў. Цяпер у склад адкрытага акцыянернага таварыства ўваходзіць 45 населеных пунктаў з трох сельсаветаў. Гаспадарка стала гучаць не толькі ў сваім раёне, але і ў вобласці, краіне. Цяжка назваць абласныя «Дажынкі», на якіх не адзначаліся б поспехі ў тым ці іншым кірунку «Відамлянскага».

### НАСТРОЙ НА ПРЫГАЖОСЦЬ

Але не толькі клопатамі пра надоі, прывагі, ураджаі ўсе гэтыя гады жыве кіраўнік буйнога сельгаспрадпрыемства. Разам з тэхналогіямі, культурай вытворчасці ён стаў укараняць у вясковае жыццё і культуру побыту, ствараць прыгажосць. Раней Відамля, мякка кажучы, была не такой, як цяпер. Цэнтр даволі вялікага населенага пункта размяшчаецца на пагорку. Дык вось тут побач з адміністрацыйнымі будынкамі, крамамі разрасліся старыя дрэвы разам з хмызняком. А праз цэнтральную вуліцу хадзілі на выган каровы з усімі наступствамі для дарогі, дарэчы, рэспубліканскай, на Белавежскую пушчу. Мясцовыя ж гаспадыні на пытанне новага старшыні «Чаму паабапал агароджы не вырошчваюць кветкі?» звычайна гаварылі, што зямля тут непрыдатная, кветкі расці не хочуць.

І новы старшыня пачаў з навядзення парадку не толькі на вытворчасці, але і на цэнтральнай сядзібе. Прыбралі каля канторы, зрэзалі старыя дрэвы і кусты, пачалі высаджваць кветкі. Тады ж разам з сельвыканкамам, старастай вёскі арганізавалі сходы, правялі тлумачальную работу. У выніку гаспадары раздзялілі прыватны статак на два і памянялі маршрут выгану кароў з тым, каб цэнтральная частка населенага пункта заставалася чыстай. Праўда, цяпер кароў засталося ў вяскоўцаў мала, а вось традыцыі чысціні прыжыліся.

У гаспадарцы з'явілася новая штатная адзінка — работнік па азеляненні. Вясной і восенню на суботнікі па добраўпарадкаванні выходзілі ўсе спецыялісты гаспадаркі і сельвыканкама. Кожны год на вуліцах з'яўляліся новыя саджанцы дэкаратыўных кустоў, кветак. Міхаіл Страпко прывозіў іх нават з замежных камандзіровак, каб даказаць скептыкам, што ўсё тут цудоўна можа расці, калі расліну як трэба дагледаць.

— Сталі ўпрыгожваць усе вытворчыя аб'екты, фермы, — расказвае кіраўнік гаспадаркі. — Вось прыязджаюць на працу маладыя спецыялісты. Хто з іх захоча застацца ў недагледжанай вёсцы? Кожны дзень на работу прыходзяць механізатары, кіроўцы, іншыя работнікі. Яны бачаць не засмечаныя гаспадарчыя і машынныя двары, а парадак на тэрыторыі, клумбы з кветкамі, якія радуюць вока. Гэта міжволі настройвае на пазітыў. Аказалася, што стварыць прыгожы куточак каля кожнага са складоў не з'яўляецца праблемай. Заўсёды знойдзецца чалавек, які гэта любіць. На тэрыторыі збожжатока жанчыны здолелі так размясціць куточкі з кветкамі, што яны відаць адусюль. Зойдзеш падчас уборкі — тоны збожжа наўкола ляжаць, а побач абавязкова нешта цвіце.

Калі да гаспадаркі далучылі дзве суседнія, на аддаленых фермах захапленне падтрымалі. Аднойчы на адной з фермаў кветкі пабіў град. «Прыязджаю, а жанчыны ледзь не плачуць, — расказваў Міхаіл Мікалаевіч. — Прывезлі ім новыя расліны, паправілі клумбы, мяне ж парадавала, што людзі аказаліся такія чуйныя да прыгажосці».

У Відамлі штогод праводзіцца спаборніцтва на найлепшую сядзібу. Пераможцаў ушаноўваюць на ўрачыстых мерапрыемствах, дык вось падзячныя пісьмы падпісваюць два кіраўнікі — мясцовай улады і гаспадаркі. На днях вёсак, якія праходзяць кожнае лета, вядома, гаспадарка выступае галоўным спонсарам і актыўным удзельнікам мерапрыемстваў.

### РАБОТА НА ПЕРСПЕКТЫВУ ГАСПАДАРКІ

Да справы добраўпарадкавання падключылася і школа. Каля 90 працэнтаў расады кветак вырошчваецца на школьным участку. Школу кіраўніцтва «Відамлянскага» не проста падтрымлівае — з ёй працуюць на пастаяннай аснове. Паводле меркавання дырэктара, гэта работа на перспектыву гаспадаркі. Сельгаспрадпрыемства заахвочвае дзяцей за старанную вучобу, арыентуе на выбар прафесіі, звязанай з сельскай гаспадаркай. У гаспадарцы ёсць працоўныя дынастыі, якія складаюцца з трох пакаленняў. І вось такіх людзей заўсёды заўважаюць, запрашаюць у школу, расказваюць пра іх цяперашнім вучням. Тут нязменна адзначаюць здольных студэнтаў каледжаў, ліцэяў з ліку практыкантаў, запрашаюць на работу, забяспечваюць жыллём, асабліва ахвотна бяруць на работу выпускнікоў.

Зараз у Відамлянскай школе вучыцца паўтары сотні хлопчыкаў і дзяўчынак. Некалькі гадоў таму быў узведзены новы корпус навучальнай установы. І на ўсіх святах, прысвечаных выпуску ці Дню ведаў, Міхаіл Страпко лічыць сваім абавязкам быць у школе, каб сказаць добрыя словы маладому пакаленню вяскоўцаў, якія перыядычна папаўняюць шэрагі вытворчага калектыву.

### БЯДУЛЕВА ШКОЛА

У размове з Міхаілам Мікалаевічам аўтар гэтых радкоў згадала, як некалі прыехала да двойчы Героя Сацыялістычнай Працы Уладзіміра Бядулі на інтэрв'ю. Аксакал ад сельскай гаспадаркі ва ўласцівай яму манеры запрасіў сесці і адразу стаў дыктаваць: «Пішы так: калгас — гэта людзі».

— Лепей і не скажаш, — падхапіў Міхаіл Мікалаевіч. — Я прайшоў Бядулеву школу, засвоіў яго ўстаноўку, што працаўніка трэба шанаваць і тады, калі ён шчыруе на полі, на ферме, у майстэрні, і не забываць, калі выйдзе на пенсію. Так, цяперашнія рабочыя, спецыялісты ствараюць і развіваюць вытворчую базу, зарабляюць прыбытак, але ж гэта робіцца на падмурку гаспадаркі, якую сваімі рукамі стваралі папярэднікі. Іх не варта забываць.

Вядома, цяпер у склад акцыянернага таварыства ўваходзіць чатыры з паловай дзясяткі населеных пунктаў, дзе пражывае даволі шмат ветэранаў калгаснай вытворчасці. Усіх пенсіянераў адзначаюць да Дня работніка сельскай гаспадаркі, ёсць у калектыўным дагаворы пункты, што датычацца дапамогі ветэранам працы. На юбілей, калі работнік адзначае круглую дату, абавязкова выязджае прадстаўнік гаспадаркі з кветкамі, грашовай дапамогай, каб сустрэцца, падзякаваць за працу, сказаць добрыя словы.

— Ну, а тых, каму спаўняецца 80 альбо 90, я проста не магу не паехаць і не павіншаваць асабіста, — працягвае Міхаіл Страпко. — За апошнія месяц-паўтара віншаваў трох 90-гадовых юбілярак: Веру Мікітаўну Алексяйчук з Шышова, Яўгенію Кірылаўну Міранюк з вёскі Падбела, Лізавету Нiканаўну Славуціч з вёскі Мартынюкі.

Апошняя, можна сказаць, чалавек-легенда, шмат гадоў працавала трактарысткай у гаспадарцы. Да Лізаветы Нiканаўны мы завіталі зранку і зарадзіліся пазітывам на ўвесь дзень. Столькі было ўспамінаў пра работу, пра калгасную бытнасць, пра жыццё іх пакалення! Гэтыя людзі, як правіла, добра памятаюць часы сваёй маладосці і могуць расказаць шмат цікавага. Да віноўніц урачыстасці абавязкова заходзілі суседкі, каб упэўніцца, што сам старшыня прыехаў павіншаваць юбілярку. Яны па-ранейшаму называюць гаспадарку калгасам, а кіраўніка — старшынёй.

— Яшчэ некалькі гадоў таму ў нас было пяць ветэранаў-трактарыстак. Аднойчы мы ў іх гонар зладзілі асаблівае ўшанаванне. Скажам, Галіна Іванюк атрымлівала ў свой час два імянныя МТЗ-82. Яе справу ў гаспадарцы працягнуў сын Віктар. Ды тут кожная з жанчын-трактарыстак вартая цэлага дакументальнага фільма, прынамсі старонкі ў кнізе працоўнай славы. Ну і дынастыі мы ўсяляк падтрымліваем, гэта ж у плане прыкладу, выхавання кадраў — найлепшы дапаможнік, — гаворыць кіраўнік гаспадаркі.

* * *

Так і працуе ўсе гады дырэктар ААТ «Відамлянскае» на карысць не толькі сваёй гаспадаркі, але і на паляпшэнне, развіццё аграгарадка. Калі ён прыйшоў, Дом культуры стаяў пусты, зараз будынак капітальна адрамантаваны і вернуты да жыцця, тут праходзяць самыя розныя мерапрыемствы. Побач са школай, на самым бачным месцы, пабудавалі царкву. Цікава, што раней ў Відамлі ніколі не было храма. Гэтая ініцыятыва нарадзілася ў асяродку людзей старэйшага пакалення, кіраўнік гаспадаркі падтрымаў. Будавалі ўсёй грамадой, Свята-Пакроўскую царкву асвяцілі дзесяць гадоў таму.

Як старшыня Брэсцкага абласнога аграпрамысловага саюза Міхаіл Страпко вялікую ўвагу ўдзяляе падтрымцы кіраўнікоў-ветэранаў сельгасвытворчасці. Падтрымлівае ўсе праекты ў сваёй мясцовасці па добраўпарадкаванні і паляпшэнні тэрыторыі. Не адно скліканне працаваў у раённым і абласным Саветах дэпутатаў. А два гады таму Міхаіл Мікалаевіч стаў ганаровым грамадзянінам Камянецкага раёна.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Валерыя КАРАЛЯ.**
*Камянецкі раён.*

ПОЎНЫ ТЭКСТ КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ СА ЗМЯНЕННЯМІ І ДАПАЎНЕННЯМІ, ЯКІЯ ВЫНОСЯЦЦА НА РЭФЕРЭНДУМ, — У НУМАРЫ «ЗВЯЗДЫ» ЗА 22 СТУДЗЕНЯ І НА САЙЦЕ ZVIAZDA.BY

Саюзная рашучасць — 2022

# УМОЎНЫ ПРАЦІЎНІК ЛІКВІДАВАНЫ

## На сумесным беларуска-расійскім вучэнні адпрацавалі задачы па знішчэнні бандфарміраванняў

**Незаконнае ўзброенае фарміраванне з дапамогай сродкаў узмацнення было блакіравана на палігоне «Брэсцкі» механізаваным батальёнам Узброеных Сіл Расіі. Разам з беларускімі дэсантнікамі, якія падключыліся да аперацыі, бандфарміраванне ўдалося знішчыць. Канешне, праціўнік у нашых войскаў быў умоўны. А калі нават і рэальны, можна не сумнявацца: ваеннаслужачыя Саюзнай дзяржавы з такім жа прафесіяналізмам, які паказалі ўчора, ліквідавалі б яго.**



Акрамя таго, пад Брэстам падраздзяленні сіл спецыяльных аперацый нашай краіны разам з Паветрана-дэсантнымі войскамі і мотастралковымі падраздзяленнямі расійскай арміі адпрацавалі пытанні ўзяцця пад ахову ваенных аб'ектаў, тылавых калон, а таксама ўскрыцця схронаў незаконных узброеных фарміраванняў.

Шэраг вучэбна-баявых задач былі ўчора адпрацаваныя і ў іншых месцах. На палігоне «Гожскі» механізаваныя падраздзяленні беларускай арміі вялі абарончы бой. Раёны абароны вайсковых часцей, а таксама пункты кіравання і агнявыя пазіцыі ад удараў сродкаў паветранага нападзення праціўніка прыкрывалі падраздзяленні супрацьпаветранай абароны. На ўчастку мясцовасці «Лунінец» у атаку з ворагам уступілі зенітныя ракетныя падраздзяленні расійскай арміі. Штурмавая авіяцыя Паветрана-касмічных сіл нашага стратэгічнага саюзніка перахапіла паветраныя сілы праціўніка.



Ракетныя падраздзяленні нашай краіны ўчора неслі баявое дзяжурства на ўчастку мясцовасці «Палескі». На ўчастку мясцовасці «Гомель» прадстаўнікі Паветрана-дэсантных войскаў Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі правялі розыгрыш разведвальна-пошукавых дзеянняў, у ходзе якога блакіравалі і знішчылі дыверсійна-разведвальныя групы ўмоўнага ворага. Пад Баранавічамі падраздзяленні марской пяхоты расійскай арміі з баявой стральбой адбілі ўдары сродкаў паветранага нападзення праціўніка. Механізаваныя брыгады нашай арміі правялі вучэбны абарончы бой. Адбіццё ўдараў сродкаў паветранага нападзення ўмоўнага праціўніка, а таксама захаванне жывучасці, вывàду і заняцця абарончых рубяжоў, пераправы водных перашкоды мотастралковыя злучэнні Узброеных Сіл Расіі ажыццявілі на ўчастку «Рэчыца».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота «Ваяр».**

Гучная справа

# АКТ ДЗЯРЖАЎНАГА ВАНДАЛІЗМУ

## Генеральная пракуратура Беларусі ўзбудзіла крымінальную справу ў дачыненні да мэра Дняпра Барыса Філатава

**Украінскаму чыноўніку інкрымінавана распальванне нацыянальнай варожасці. Пра гэта паведамляецца ў тэлеграм-канале Генпракуратуры.**

Устаноўлена, што падазроны, з'яўляючыся службовай асобай, арганізаваў зняцце нацыянальнага сімвала Рэспублікі Беларусь — Дзяржаўнага сцяга, размешчанага каля ўвахода ў будынак гарадскога Савета, і замену яго на палотнішча бел-чырвона-белага колеру. Паздзекаваўшыся з гістарычнай і культурнай рэліквіі, ён тым самым прынізіў нацыянальны гонар і годнасць беларусаў. Гэта відавочна шкодзіць цесным і дружалюбным сувязям нашых народаў, сведчыць аб нежаданні весці канструктыўны дыялог.

Супрацьпраўныя дзеянні кваліфікаваны па ч. 2 арт. 130 Крымінальнага кодэкса. Для арганізацыі папярэдняга расследавання крымінальная справа накіравана ў Следчы камітэт Беларусі.

Раней Пасольства Беларусі ва Украіне накіравала ў Міністэрства замежных спраў Украіны ноту ў сувязі з інцыдэнтам у Дняпры. У пасольстве заявілі, што беларускі бок разглядае здарэнне як цынічную праяву недружалюбных адносін да суверэннай беларускай нацыі і акт дзяржаўнага вандалізму з боку ўлад Украіны, што грубым чынам парушае асноўныя прынцыпы міжнароднага права: прынцып суверэннай роўнасці дзяржаў і прынцып неўмяшання ва ўнутраныя справы дзяржаў, а таксама нормы міжнародных адносін, прынятыя ў цывілізаваным свеце, дыпламатычнай і пратакольнай практыкі.

«Беларускі бок патрабуе, каб вярнулі Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь на месца яго ўстаноўкі, афіцыйна папрасілі прабачэння, а таксама правядзення разбору па факце ганьбавання афіцыйных сімвалаў замежнай дзяржавы, інфармавання аб яго выніках і прыняцця вычарпальных мер па недапушчэнні паўтарэння такіх фактаў у будучыні», — падкрэслілі ў пасольстве.

У Міністэрства замежных спраў Беларусі быў выкліканы пасол Украіны Ігар Кізім, якому быў заяўлены рашучы пратэст у сувязі з інцыдэнтам ва ўкраінскім горадзе Днепр, дзе па рашэнні мэра горада Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь быў заменены на іншую сімволіку. «Да ўкраінскага боку было даведзена, што ў Беларусі разглядаюць гэту цынічную праяву недружалюбных адносін да суверэннай нацыі як акт дзяржаўнага вандалізму, які грубым чынам парушае асноўныя прынцыпы міжнароднага права — прынцып суверэннай роўнасці дзяржаў і прынцып неўмяшання ва ўнутраныя справы дзяржаў, — а таксама нормы міжнародных адносін, прынятыя ў цывілізаваным свеце, дыпламатычнай і пратакольнай практыкі», — падкрэслілі ў міністэрстве.

Пасол быў папярэджаны аб тым, што ў выпадку невыканання агучаных на сустрэчы патрабаванняў беларускі бок пакідае за сабой права прыняць далейшыя суразмерныя крокі.

**Пётр ДУНЬКО.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне члену Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Старавойтавай Ганне Валянцінаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

# ГЕРОЙСКІ ЎЧЫНАК

## 13-гадовы Багдан Шэлег з Маларыцкага раёна выратаваў дзвюх сястрычак падчас пажару

**У ноч на пятніцу ў адным з дамоў у вёсцы Макраны адбылося ўзгаранне. У пакоі спалі дзеці. Старэйшы Багдан прачнуўся ад сігналу пажарнага апавяшчальніка. Хлопец не разгубіўся, хутка раскатурхаў меншых сясцёр, адной з іх 7 гадоў, другой — 3. Дым ужо вылядаў вочы, а ручак, каб адкрыць, на акне не аказалася, тады адважны падлетак выбіў шклопакет, пасадзіў дзяўчынак на падаконнік, каб глынулі паветра, сам выскачыў на двор і па чарзе зняў дзяўчынак адну за другой. Усё гэта адбылося за секунды.**

Калі па званку суседзяў ратавальнікі прыехалі на месца, з дома валіў дым, а дзеці былі на вуліцы — пра гэта карэспандэнту газеты расказаў **старшыня Макранскага сельскага Савета Пётр ГУБЕЙ**.

Пётр Вікенцьевіч дадаў, што Багдан з 7-гадовай Палінай зараз у бальніцы, хлопчык параніў руку шклом, малодшай з сям'і шпіталізацыя не спатрэбілася. Кіраўнік мясцовай улады дадаў, што ў прычынах пажару разбіраюцца спецыялісты. Бацькі гэтага сямейства працуюць па зменах на жывёлагадоўчым комплексе. Муж той ноччу ўжо выехаў з дому, а жонка яшчэ не вярнулася. І вось у гэтым прамежку, які склаў прыкладна 30 хвілін, здарылася бяда.

**Старшыня Маларыцкага райвыканкама Міхаіл БАЦЭНКА** на сваёй старонцы ў сацсетках назваў Багдана, якому толькі ў верасні будзе 14 гадоў, сапраўдным героем. Кіраўнік раёна збіраецца наведаць падлетка ў бальніцы, як толькі дазволяць урачы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Высокая інфляцыя і запавoленне росту: у эканамічным прагнозе ЕС пераважае песімізм

Еўракамісія чакае, што высокія цэны на газ і нафтапрадукты прывядуць да яшчэ большай інфляцыі і запаволяць агульную перспектыву росту ў ЕС і еўразоне. Такі малааптымістычны прагноз прадставіў у Бруселі еўракамісар па эканоміцы Паала Джэнцілонэ, паведамляе Euronews.

«Высокія цэны на энерганосьбіты, парушэнні паставак і базавыя эфекты аказваюць моцны ўплыў на рост спажывецкіх цэн. У параўнанні з асеннімі прагнозамі прагнозы інфляцыі на гэты год значна перагледжаны ў бок павышэння. Ф'ючарсныя кантракты сведчаць, што цэны на энерганосьбіты застануцца высокімі на больш працяглы час, а цэнавы ціск будзе распаўсюджвацца на некалькі катэгорый тавараў і паслуг», — заявіў Паала Джэнцілонэ.

Каб утрымаць цэны на нізкім і стабільным узроўні, Еўрапейскі цэнтральны банк устанавіў мэтавы паказчык інфляцыі на ўзроўні двух працэнтаў. У той жа час Еўракамісія прагназуе, што гадавая інфляцыя ў зоне еўра складзе 3,5 працэнта ў 2022 годзе.

Эксперты асцярожныя адносна прагнозаў, улічваючы, што з-за пандэміі ва ўсім свеце застаецца высокай няпэўнасць наконт магчымых збояў у рабоце ланцужкоў паставак. А боязь наконт росту інфляцыі або ўзмацнення грашова-крэдытнай палітыкі аказваюць уплыў на глабальныя рынкі.

### Бельгійскія настаўнікі выйшлі на акцыю пратэсту: стаміліся ад рэформ і лакдаўнаў



Настаўнікі і іншыя школьныя работнікі выйшлі на вуліцы Бруселя, каб выказаць незадаволенасць рэформамі адукацыі ў краіне, скарачэннямі бюджэтных асігнаванняў і высокай нагрузкай на педагогаў. Удзельнікі дэманстрацыі папярэджваюць, што пратэсты ў Бельгіі хутка распаўсюдзяцца на ўсю Еўропу, паведамляе Euronews.

Пандэмія каранавіруса ўскладніла праблемы, якія стварыла нацыянальная рэформа адукацыі ў Бельгіі. Урад паставіў перад педагогамі больш складаныя задачы, падоўжыў іх рабочы дзень, правёў камп'ютарызацыю і павялічыў памер класаў.

Настаўнікі-пратэстоўцы гавораць аб высокіх нагрузках для школьных работнікаў. Педагогі таксама патрабуюць скараціць колькасць вучняў у класах. Многія настаўнікі не хочуць браць на сябе адказнасць за тое, што вучэбная праграма дрэнна выконваецца, вучэбны працэс пастаянна перапыняецца з-за лакдаўнаў і іншых абмежавальных мер, паспяхова падае.

«У нас найлепшая работа ў свеце. Мы ўсе любім сваю работу, але ўлады не даюць нам магчымасці і далей любіць сваю работу», — гаворыць яшчэ адна ўдзельніца пратэсту.

Калі сітуацыя будзе пагаршацца, бельгійскія настаўнікі маюць намер стварыць саюзы са сваімі калегамі ў іншых краінах Еўрасаюза, каб разам дабівацца перамен да лепшага.

### У Германіі назвалі ўз'яднанне Крыма і Расіі «фактам, да якога трэба прывыкнуць»

Лідар апазіцыйнай партыі «Альтэрнатыва для Германіі» Ціна Хрупала назваў далучэнне Крыма да Расіі фактам. Аб гэтым ён сказаў у эфіры тэлеканала ZDF.

«Гэта факт, да якога мы ўжо ў пэўнай ступені павінны прывыкнуць, таму што Расія, зразумела, не аддасць Крым», — сказаў палітык.

Ён нагадаў, што на крымскім паўвостраве было праведзена галасаванне, і яго жыхары выбралі ўз'яднанне з Расіяй.

У сакавіку 2014 года ў Крыме прайшоў рэферэндум, па выніках якога паўвостраў стаў тэрытарыяльнай часткай Расіі, а Севастопаль — горадам федэральнага значэння.

# АДДАМ ДОБРЫЯ РЭЧЫ Ў ЧУЖЫЯ РУКІ

**Шмат каму з нас знаёмая праблема: назапасіліся дабротныя, але ўжо не патрэбныя рэчы. Ёсць некалькі варыянтаў, як імі распарадзіцца. У нашым аглядзе не толькі адрасы, па якіх прымаюць такія рэчы, але і рэкамендацыі, як гэта лепш зрабіць, а таксама некаторыя разважанні аб матывах паводзін тых, хто аддае і хто атрымлівае.**

## КОЖНЫ ВЫБІРАЕ ПА САБЕ

У канцы сезона мая прыяцелька перагледае гардэроб усёй сям'і і вырашае: што пакінуць, а што ўжо добра б абнавіць. Мінулай восенню жанчына вырашыла адмовіцца ад паліто, якому пяць гадоў, але апранала яна яго вельмі рэдка. Знайшліся цалкам дыхтоўныя, састарэлыя рэчы або якія надакучылі, і ў гардэробе ў мужа. Прадаваць ці неяк інакш іх уладкаваць проста няма часу. Таму непатрэбнае акуратна складаецца ў вялікія чыстыя пакеты і выносіцца да кантэйнернай пляцоўкі. Усё гэтае дабро хутка разбіраецца. «Няхай носяць на здароўе, — кажа Лена. — У нас шафы не перагружаныя, я веру ў тое, што захоўванне старых рэчаў неспрыяльна ўплывае на псіхалагічны стан».

А вось яе суседка лічыць інакш: «Трасе ад думкі, што маю куртку надзене нейкі бомж і «забярэ» мой дабрабыт». Таму яна рве, рэжа яе і ў такім выглядзе выкідвае.

Здавалася б, непатрэбныя рэчы. Але як шмат стаўленне да іх расказвае пра чалавека: адзін расстаецца, каб спатрэбіліся іншым, другі знішчае, каб ніхто не змог скарыстацца.

## ДАРМАЎШЧЫНА ПСУЕ ЛЮДЗЕЙ

Узнікаюць псіхалагічныя праблемы і тады, калі мы аддаём непатрэбныя рэчы знаёмым. «Дзяўчынка суседкі практычна вырасла ў адзенні маёй дачкі. Розніца ва ўзросце ў дзяцей восем месяцаў, — дзеліцца мінчанка Ірына. — Праблемы пачаліся, калі дзяўчаты былі ў падлеткавым узросце. Дачка суседкі пыталася ў маёй адкрытым тэкстам: калі твая мама аддасць мне тваю куртку (джынсы, заплечнік)? Мая Маша была ў шоку, ды і я таксама. Тут і суседка пачала «пілаваць»: у вас ёсць грошы, вы можаце купіць новае, а маёй у чым хадзіць? Мяне яна абвінавacіла ў наяўнасці мужа, футра і добрай працы. А суседка ў разводзе, аліменты мізер, сама мала зарабляе, таму ўпэўнена, што ёй усе павінны. Паміж намі была цяжкая размова, пасля якой суседка перастала вітацца. Яе дачка спрабавала арганізаваць ганенне на ёй дачкі ў школе. На шчасце, аднакласнікі не падтрымалі».

Мая сяброўка Вольга разам з дзецьмі аказалася распарадчыкам маёмасці памерлай свякрыві. Неяк Вольгу падпільнавала суседка памерлай жанчыны і спытала, ці можа яна аддаць ёй пару рэчаў. Дэмісезоннае паліто пасля хімчысткі свякроў так і не паспела надзець, а чаравікі былі практычна новыя, з напалову сцёртымі фабрычнымі набойкамі. Оля вынесла жанчыне паліто, у кішэні якога ляжалі адпоратыя гузікі, і ідэальна вычышчаныя чаравікі ў скрыньцы. Замест падзякі суседка расказала ўсяму кварталу, што ў Вольгі няма сумлення і павагі да пажылых людзей: гузікі ў паліто не прышыла і набойкі новыя не зрабіла. Праўда, падтрымкі яна




не знайшла. Цяпер вось і на пажылых дам пакрыўджана. Яны ёй сказалі, маўляў, у дармавое паліто можна і самой прышыць гузікі, а ўжо калі эканоміш на чаравіках, дык знайдзі грошы на набойкі.

Мараль гэтых гісторый такая: Ірына і Вольга на сваім вопыце пераканаліся, што ў атрымальнікаў «халявы» моцна псуецца характар. Цяпер добрыя рэчы, якія ім непатрэбны, аддаюць праз пасрэдніка — дабрачынныя арганізацыі. Жанчыны мяркуюць, што такім чынам рэчы трапяць менавіта да тых, хто аказаўся ў складанай жыццёвай сітуацыі, а не проста да нахабных аматараў дармаўшчыны.

## БОЛЬШ АДДАЮЦЬ У МІНСКУ, А АТРЫМЛІВАЮЦЬ У РЭГІЁНАХ

На запыт у інтэрнэце «куды аддаць непатрэбныя рэчы» адказаў вельмі шмат. Кожны можа выбраць прыдатны варыянт. Хтосьці давярае Чырвонаму Крыжу, іншы хоча дапамагчы Асацыяцыі шматдзетных бацькоў. Цяпер шмат і грамадскіх арганізацый, валанцёраў, якія займаюцца зборам і размеркаваннем гуманітарнай дапамогі.

З некаторымі мы паразмаўлялі і даведаліся нямала цікавага. Напрыклад, Беларускі фонд міласэрнасці і здароўя прымае выключна сезонныя рэчы. Знаходзіцца ён у Мінску на вуліцы К. Маркса, 39. Папярэдне прасіць тэлефанаваць на нумар +375 17 327 28 80.

У Беларускай асацыяцыі дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам (тэл.: +375 17 320 03 88; 316 73 90) расказалі, што ім патрэбна адзенне, абутак для людзей ва ўзроставай катэгорыі ад 16 да 40 гадоў. Так атрымліваецца, што больш за ўсё рэчаў прыносяць мінчане, а тыя, хто мае патрэбу, ёсць ва ўсіх рэгіёнах. Па іх заяўках камплектуюцца пасылкі і адпраўляюцца адрасатам.

Міжнародная грамадская арганізацыя «SOS-Дзіцячыя вёскі» будзе ўдзячная за цацкі, спартыўны інвентар, фарбы, пластылін, альбомы, кнігі, пасцельную бялізну, сродкі па доглядзе дзяцей. А вось дзіцячае адзенне тут прымаюць, толькі калі ёсць заяўка. Звязацца з прадстаўнікамі арганізацыі можна па тэлефонах у Мінску +375 17 375-82-70, у Бараўлянах +375 17 511-32-01, у Мар'інай Горцы +375 1713 3-48-92 і ў Магілёве +375 222 79-49-44.

## КАМУ АДДАЦЬ І ДЗЕ АТРЫМАЦЬ

Пры храме іконы Божай Маці «Усецарыца» (Мінск, вул. Чыгуначная, 23Г) прымаюць не толькі адзенне, абутак, але і кнігі, пасцельную бялізну, посуд, дробную бытавую тэхніку. «Нашы падапечныя — бяздомныя, інваліды, адзінокія пажылыя людзі, якія аказаліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, — патлумачыла валанцёр Наталля Блышчык. — Мы таксама апякуем хоспісы, таму запатрабавана пасцельная бялізна, сродкі гігіены і догляду». На тэрыторыі храма ёсць палатка, у якой тыя, хто мае патрэбу, могуць атрымаць неабходныя рэчы. Абавязкова папярэдне патэлефануйце па нумары +375 44 557-02-59 і дамоўцеся аб даце і часе візіту ў храм.

Таксама не абмяжоўваюцца прыёмам толькі адзення і абутку ў дабрачыннай арганізацыі «АДРА Беларусь». Тут запатрабаваны дзіцячыя цацкі, бытавая тэхніка, мэбля, будаўнічыя і аддзелачныя матэрыялы. Усё, акрамя мэблі ды іншых буйных рэчаў, можна прывезці ў офіс арганізацыі на вуліцу Акрэсціна, 56 у Мінску. Аб непатрэбнай мэблі і бытавой тэхніцы паведамляюць на Vaber +375 29 692-84-04, сюды ж адпраўляюць заяўкі тыя, хто мае патрэбу. Непасрэдна дабрачынец і атрымальнік дамаўляюцца аб спосабах вывазу буйных рэчаў. Будаўнічыя і аддзелачныя матэрыялы, дакладней, часцей за ўсё іх рэшткі, прымаюць тут для праекта «Камфортная старасць». А ўжо валанцёры выкарыстоўваюць іх, калі робяць касметычны рамонт у кватэрах адзінокіх пажылых людзей.

Праект «Падзяліся ежай» гэтая дабрачынная арганізацыя ажыццяўляе з адной з гандлёвых сетак. Валанцёры фарміруюць наборы з прадуктаў, якія доўга захоўваюцца, што ахвяравалі пакупнікі. Затым раздаюць іх людзям, якія жывуць у нястачы.

Атрымаць дапамогу ад «АДРА Беларусь» можна раз на тыдзень па мінскім адрасе: вуліца Люцыянская, 17 (аддзяленне дзённага знаходжання для інвалідаў тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Фрунзенскага раёна). Валанцёры нагадваюць, што ў такім выпадку трэба пацвердзіць сваё цяжкае становішча: прад'явіць пасведчанне пенсіянера ці інваліда, даведку аб вызваленні з месяцаў пазбаўлення волі. «АДРА Беларусь» праводзіць дабрачынныя кірмашы па ўсёй краіне. Падрабязнасці аб тым, як аказаць або атрымаць дапамогу гэтай дабрачыннай арганізацыі, можна даведацца па тэлефоне +375 29 692-84-04.

## «ЧЫРВОНЫ КРЫЖ», МАНАСТЫР І ІНТЭРНЭТ

Для тых мінчан, у якіх няма часу на візіты ў дамоўлены час, Чырвоны Крыж арганізаваў збор адзення, абутку, пасцельнай бялізны, коўдраў, сумак, рукзакоў, цацак у спецыяльныя кантэйнеры. Яны стаяць на запраўках А-100, размешчаных па вул. Казіміраўская, 39 (МКАД); вул. Акадэмічная, 34; вул. Баравая, 7.

У Магілёве такі кантэйнер ёсць па адрасе Мінская шаша, 31, ГЦ «Парк Сіці». У Гомелі кантэйнеры знаходзяцца па чатырох адрасах: вул. Матросава, д. 6; вул. Свірыдава, д. 1, к. 2; вул. Тэльмана, 39 і вул. Станцыйная, 1. Ва ўсіх гарадах Гомельскай вобласці, акрамя Нароўлі, устаноўлены такія кантэйнеры. У Брэсцкай вобласці ўжо сем кантэйнераў:

| | |
|---|---|
| **Брэст** | **вул. Арлоўская, 28Д** |
| **Маларыта** | **вул. Савецкая, 96** |
| **Жабінка** | **вул. Кірава, 12Б** |
| **Камянец** | **вул. 1 Мая, 3** |
| **Пружаны** | **вул. Лазо, 6** |
| **Кобрын** | **вул. 700-годдзя Кобрына, 6** |
| **Ляхавічы** | **вул. Чкалава, 56** |

У будныя дні з 7.00, у суботу і нядзелю з 8.00 і да 21.00 можна пакінуць складзеныя ў пакеты рэчы ў мінскім Чырвоным касцёле (вул. Савецкая, 15). Тут ёсць спецыяльныя скрыні каля бакавога ўвахода ў храм.

Прымаюць адзенне і абутак для тых, хто мае патрэбу, у Свята-Елісавецінскім манастыры (Мінск, вул. Выгоцкага, 6, +375 29 121-25-41 — дзяжурная сястра). Сюды лепш прыязджаць днём, каб прагуляцца па тэрыторыі, наведаць крамы, дзе прадаюцца прадукты з манастырскага падворка, смачная выпечка, вырабы з майстэрань.

Старыя коўдры, пледы і ручнікі можна аддаць у любыя арганізацыі, якія аказваюць дапамогу кінутым катам і сабакам.

Ахвотным аддаць і атрымаць бясплатна рэчы — інтэрнэт у дапамогу. Ёсць шмат сайтаў і супольнасцяў у сацсетках. Вось некаторыя з іх: «Забірай Дарам. BY»; otdam.by; by.yaotdam.ru; darby.by; baraholka.onliner.by; leboard.ru.

## ВЫ САМІ ТАКОЕ НАДЗЕНЕЦЕ?

На жаль, кожны валанцёр можа распавесці гісторыю пра тое, што «прыйшоў чалавек, які вельмі ганарыўся сабой (дапамагае гаротнікам), прыносіў мяшок рэчаў, а калі яго распакавалі, то там былі дзіравыя шкарпэткі ці зацыраваныя жакеткі». Былі і такія выпадкі, калі «дарыцель» прасіў, маўляў, прыязджайце, забярыце шмат рэчаў. Аказвалася, што такім чынам спадкаемцы пазбаўляліся ад непатрэбнага ім хламу — менавіта ў такім стане было адзенне іх памерлых сваякоў.

Таму, перш чым аддаваць рэч на дабрачыннасць, шчыра адкажыце: вы самі такое надзенеце? Усе валанцёры прасілі нагадаць: рэчы павінны быць у нармальным стане, гэта значыць, без дзірак, цыроўкі, чыстыя, са спраўнымі маланкамі. Заўсёды аддаецца перавага сезонным рэчам. У Свята-Елісавецінскім манастыры больш за ўсё рады мужчынскаму адзенню і абутку, такі ж асартымент найбольш запатрабаваны ў дамах начнога знаходжання асоб без пэўнага месца жыхарства.

Патэлефануйце ў папярэдне абраную арганізацыю і ўдакладніце ўсе нюансы.

Думайце аб тых, каму прызначана дапамога: што парадуе пажылога чалавека, тое не падыдзе маладому інваліду.

**Хто яшчэ прымае і раздае рэчы:**

**БГА «Чарнобыльскі бусел»: +375 29 666 36 21;**

**Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў: +375 17 322-42-18, +375 17 226-42-18;**

**Дабрачынны праект KaliLaska: +375 29 606-11-04.**

І гэта далёка не поўны пералік.

**Маргарыта ДРАЗДОВА.**

Віцебская абласная інспекцыя Дзяржстандарта выявіла неікру неіснуючых вытворцаў

# А што ўнутры неікры?

**Прадукцыю па прывабнай цане актыўна прапаноўвалі спажыўцам на рынках і кірмашах, у гандлёвай сетцы Віцебска і Оршы ў канцы снежня — пачатку студзеня. Пільную ўвагу інспектараў прыцягнула імпартная ласасёвая ікра і кансерваваная рыбная прадукцыя 10 вытворцаў. Парушэнні былі ўстаноўлены ва ўсіх.**

— Вывучэнне толькі маркіроўкі гэтай прадукцыі прывяло да таго, што яе рэалізацыю мы забаранілі, — адзначыла **начальнік Віцебскай абласной інспекцыі Дзяржстандарта Аксана МУРАШКЕВІЧ.** — Як аказалася, дзевяці з дзесяці названых на этыкетках вытворцаў (ТАА «Персей», «Сахал», ТАА «Сальмонікс», ТАА «Сахалін Порт», ТАА «Сахалінская ікра», ТАА «Якут-Рыб», ТАА «Дэльта», ТАА «13», ТАА «Жамчужына Камчаткі») на самай справе няма. Яны былі альбо ліквідаваныя некалькі гадоў таму, альбо звесткі пра іх адсутнічалі ў Адзіным дзяржаўным рэестры юрыдычных асоб і Адзіным дзяржаўным рэестры індывідуальных прадпрымальнікаў, размешчаных на афіцыйным сайце Федэральнай падатковай службы Расійскай Федэрацыі.

Дэкларацыі аб адпаведнасці прапанаваных гэтымі вытворцамі далікатэсаў патрабаванням тэхнічных рэгламентаў Еўразійскага эканамічнага саюза (Мытнага саюза) адсутнічалі.

— Калі ў Оршы на кірмашы «Калядная скарбніца» мы папрасілі паказаць дакументы, якія пацвярджаюць бяспеку ікры, гандлёвы павільён... зачыніўся, — дадала Аксана Мурашкевіч. — На ўсіх назвах праверанай прадукцыі адсутнічалі ўніфікаваныя кантрольныя знакі, якія павінны быць у абавязковым парадку. У склад ласасёвай крупчастай ікры кета ад ТАА «Персей», згодна з маркіроўкай, уваходзіў харчовы дадатак «Е 224», выкарыстанне якога ў вытворчасці гэтага віду прадукцыі не прадугледжана патрабаваннямі тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза.

У ходзе пазапланавай праверкі Віцебскай абласной інспекцыі Дзяржстандарта аднаго з суб'ектаў гандлю чатыры найменні ікры ласасёвай крупчастай, выробленыя ТАА «Персей», ТАА «Дэльт», ТАА «13», ТАА «Жамчужына Камчаткі», былі выпрабаваны ў Інстытуце генетыкі і цыталогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

«Вынікі паказалі, што ні адзін з гэтых узораў не ўтрымліваў ДНК ласасёвых відаў рыб (сёмга, вясёлкавая стронга, гарбуша, кіжуч, кета, нерка). Такім чынам, дадзены прадукт не з'яўляецца ікрой ласасёвых рыб, а найменне, якое ўказана вытворцам у маркіроўцы, уводзіць спажыўца ў зман адносна выгляду і паходжання прадукту», — адзначылі ў прэс-службе Дзяржстандарта.



Фота прэс-службы Дзяржстандарта.

**Ікра, выяўленая падчас наглядных мерапрыемстваў Інспекцыяй Дзяржстандарта па Мінскай вобласці і г. Мінску.**

Па выніках праверкі «ікра» забаронена да рэалізацыі. Прыняты меры, якія абмяжоўваюць яе ўвоз на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь. Пры здзяйсненні пакупак будзьце пільныя.

**Дар'я ГАСЦІЛОВІЧ.**

# ІНДЫКАТАР ДАВЕРУ

### ФІНАНСАВЫ ДАБРАБЫТ

На думку старшыні, звароты работнікаў галіны ў прафсаюзныя структуры сведчаць, у першую чаргу, аб высокім да іх даверы, упэўненасці ў тым, што там табе дапамогуць. Людзей цікавяць пытанні заключэння, падаўжэння і скасавання контрактаў, калектыўна-дагаворнай работы, дысцыплінарных спагнанняў, узгаднення з прафсаюзам лакальных прававых актаў, кадравай работы і іншыя. Толькі за мінулы год прававыя інспектары выявілі амаль 10 тысяч парушэнняў.

Сярод галіновых прафсаюзаў Беларускі прафесійны саюз работнікаў адукацыі і навукі — першая па колькасці арганізацыя, якая аб'ядноўвае ў сваіх шэрагах прадстаўнікоў як дзяржаўных, так і прыватных устаноў адукацыі, навучэнскую моладзь, аспірантаў, дактарантаў, работнікаў Нацыянальнай акадэміі навук. Іх праблемы, занятасць і заробак — штодзённы клопат прафсаюзнай арганізацыі.

— Важным паказчыкам якасці жыцця работнікаў нашай галіны з'яўляецца ўзровень іх заработнай платы, — падкрэсліла ў сваім выступленні на пленуме Таццяна Якубовіч. — У супрацоўніцтве з Міністэрствам адукацыі і органамі дзяржаўнага кіравання асаблівую ўвагу мы ўдзяляем пытанням яе павышэння і своечасовасці выплаты. Людзі павінны быць упэўнены ў стабільнасці, у тым, што заработная плата будзе выплачана своечасова. Як сведчыць маніторынг, на працягу мінулага года ва ўстановах адукацыі не было запазычанасці па выплаце заработнай платы. Летняя адпускная кампанія таксама прайшла з захаваннем тэрмінаў выплат сярэдняга заробку за час працоўнага водпуску.

**«Сацыяльнае партнёрства» — добра адпрацаваная практыка сумеснага вырашэння многіх актуальных пытанняў».**

Па статыстычных звестках, сярэднямесячная заработная плата работнікаў галіны за студзень — лістапад 2021 года склала 952,2 рубля. Гэта 67,4 працэнта ад узроўню сярэдняй заработнай платы ў краіне: у тым ліку ў педагагічных работнікаў — 77,4 працэнта, настаўнікаў — 81 працэнт, выхавальнікаў дашкольнай адукацыі — 62,9 працэнта.

У 2021 годзе ўрадам прымаліся меры па павышэнні заработнай платы як асобных работнікаў бюджэтных арганізацый, так і ў цэлым работнікаў сістэмы адукацыі. Двойчы пераглядаўся памер базавай стаўкі, які прымяняецца для аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый. З 1 студзеня бягучага года ён таксама павялічыўся і складае 207 рублёў.

З ліпеня 2021 года памер сродкаў, што накіроўваюцца на прэміраванне работнікаў бюджэтных арганізацый, павялічыўся з 5 да 20 працэнтаў ад сумы акладаў работнікаў, а з пачатку бягучага года ў два разы павялічыўся памер аднаразовай выплаты на аздараўленне, як правіла, пры сыходзе ў працоўны водпуск.

Таксама **з 1 студзеня бягучага года настаўнікам, якія выконваюць функцыі класнага кіраўніка, і выкладчыкам — куратарам вучэбнай групы ўстаноўлена надбаўка за класнае кіраўніцтва (куратарства) у памеры 100 працэнтаў базавай стаўкі (207 рублёў).** Усё гэта садзейнічае паэтапнаму павышэнню заработнай платы работнікаў галіны і недапушчэнню зніжэння яе ўзроўню.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### У ПРЫЯРЫТЭЦЕ — ЗДАРОЎЕ

— Пандэмія прымусіла прафсаюз шукаць дадатковыя спосабы, каб падтрымаць сваіх членаў. Цяпер у многіх калектыўных дагаворах ёсць нормы аб аказанні матэрыяльнай дапамогі ў сувязі з захворваннем на COVID-19, — падкрэсліла Таццяна Якубовіч. — За два гады матэрыяльную дапамогу атрымала больш як 70,5 тысячы чалавек, у тым ліку і па хваробе. Мы разам з нашымі арганізацыямі, Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі аб'ядналі намаганні для кампенсацыі кошту пуцёўкі членам прафсаюза ў санаторыях Белпрафсаюзкурорт, якая ў сукупнасці складае ад 40 да 60 працэнтаў.

Па ініцыятыве ФПБ у санаторыях былі распрацаваны праграмы ў мэтах аднаўлення здароўя для тых, хто перахварэў на COVID-19. Як вынік — амаль 4 тысячы членаў нашага прафсаюза звярнуліся ў ЦК прафсаюза па кампенсацыю на аздараўленне ў санаторыях ФПБ.

**«Толькі за мінулы год прававыя інспектары выявілі амаль 10 тысяч парушэнняў».**

Мы разам з Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі актыўна ўключыліся ў інфармацыйную працу — тлумачылі неабходнасць вакцынацыі як сярод работнікаў, так і сярод навучэнцаў. Тыя, хто зрабіў прышчэпкі, матэрыяльна стымулююцца, ім даюцца вольныя дні пасля праходжання кожнага этапу вакцынацыі...

Падкрэслю, што пытанням аховы здароўя дзяржава ўдзяляе адмысловую ўвагу. У праекце Закона РБ «Аб змяненні законаў па пытаннях працоўных адносін» прапануецца дапоўніць Працоўны кодэкс новым артыкулам, які ўстанаўлівае гарантыі для работнікаў пры праходжанні дыспансерызацыі: магчымасць вызвалення работнікаў ад працы для праходжання дыспансерызацыі на адзін дзень адзін раз на тры гады з захаваннем сярэдняга заробку па месцы працы. Пры гэтым работнікі, якія дасягнулі 40-гадовага ўзросту, будуць вызваляцца на адзін дзень адзін раз на год. Работнікі пенсіённага ўзросту, а таксама работнікі на працягу пяці гадоў да дасягнення імі пенсіённага ўзросту — на два дні адзін раз на год з захаваннем сярэдняга заробку.

### ДАДАТКОВЫЯ САЦЫЯЛЬНЫЯ ГАРАНТЫІ

«Тэрмін «сацыяльнае партнёрства», якім сёння прынята называць узаемадзеянне ўлады і прафесійных саюзаў, — не проста гучнае азначэнне, а добра адпрацаваная практыка сумеснага вырашэння многіх актуальных пытанняў», — заўважыла Таццяна Якубовіч.

Адзін з наглядных паказчыкаў работы прафсаюзных арганізацый з сацыяльнымі партнёрамі — уключэнне ў калектыўныя дагаворы норм, якія павышаюць абарону працоўных і сацыяльна-эканамічных правоў і законных інтарэсаў работнікаў у параўнанні з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і пагадненнямі больш высокага ўзроўню.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Напрыклад, Пагадненне паміж галоўным упраўленнем па адукацыі Брэсцкага аблвыканкама і Брэсцкай абласной арганізацыяй прафсаюза на 2020—2022 гады прадугледжвае пры заключэнні (падаўжэнні) з работнікам кантракта ўстанаўленне надбаўкі ў памеры не менш як 10 працэнтаў ад аклада і атрыманне дадатковага заахвочвальнага водпуску працягласцю не менш як два каляндарныя дні.

Выпускнікам, накіраваным на работу ва ўстановы адукацыі Брэстчыны, даецца дадатковы заахвочвальны водпуск за работу па кантракце ў колькасці не менш як тры каляндарныя дні. Па сумесным хадайніцтве ўпраўлення адукацыі Брэсцкага аблвыканкама і Брэсцкай арганізацыі прафсаюза на працягу шэрагу гадоў выпускнікам (маладым спецыялістам, маладым рабочым (служачым) штомесяц кампенсуюцца выдаткі за наём жылых памяшканняў у памеры да трох базавых велічынь у Брэсце, Пінску і Баранавічах, а ў іншых населеных пунктах вобласці — да дзвюх базавых велічынь.

Калектыўны дагавор дзяржаўнага прадпрыемства «Акадэмфарм» (НАН Беларусі) прадугледжвае частковую аплату пуцёвак для санаторна-курортнага лячэння і адпачынку работнікаў і іх дзяцей за кошт сродкаў наймальніка і сродкаў прафсаюза; аказанне матэрыяльнай дапамогі на падрыхтоўку дзяцей-першакласнікаў да школы, а таксама атрыманне свабоднага дня з захаваннем заработнай платы для падрыхтоўкі дзіцяці да школы (1—4 класы); аднаразовую выплату да юбілейнай даты нараджэння пачынаючы з 50 гадоў і кожныя пяць гадоў, а таксама атрыманне аднаго свабоднага дня з захаваннем заработнай платы, пачынаючы з 35-гадовага ўзросту; аднаразовую выплату на добраўпарадкаванне для маладых спецыялістаў, якія прыйшлі на работу па размеркаванні.

Акрамя таго, «Акадэмфарм» заключыла дагаворы з прадпрыемствам «Белдзяржстрах» аб добраахвотным страхаванні медыцынскіх выдаткаў работнікаў на бясплатнае абслугоўванне ў прыватных і дзяржаўных медыцынскіх цэнтрах і шпіталізацыю ў клініках і аб страхаванні жыцця і дадатковай пенсіі для работнікаў (страхаванне правадзіцца за кошт сродкаў наймальніка).

### НАСУСТРАЧ РЭФЕРЭНДУМУ

На працягу двух гадоў Беларускі прафсаюз работнікаў адукацыі і навукі паспяхова ўзаемадзейнічае з Міністэрствам адукацыі ў рамках разгляду праектаў нарматыўных прававых дакументаў і ўнясення ў іх дапаўненняў і змен. У 2021 годзе для ўзгаднення было накіравана 13 праектаў. Шэраг прапаноў, што былі накіраваны ў Міністэрства адукацыі, датычыліся ўнясення змяненняў і дапаўненняў у Інструкцыю аб парадку правядзення атэстацыі педагагічных работнікаў сістэмы адукацыі.

Дарэчы, у сотую гадавіну прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі распачаўся рэспубліканскі сацыяльна значны праект «Педагагічныя дынастыі нашай краіны». Лідар галіновага прафсаюза паведаміла, што зараз ідзе вёрстка кнігі «Педагагічныя дынастыі Беларусі», якая ахоплівае прадстаўнікоў 112 дынастый.

Рэалізавана сумеснае рашэнне галоўнага ўпраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама і Гомельскай абласной арганізацыі прафсаюза па размяшчэнні ў кожным раёне вобласці банераў з вобразамі педагогаў — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, прадстаўнікоў педагагічных дынастый, заслужаных настаўнікаў Рэспублікі Беларусь, ветэранаў педагагічнай працы, выдатнікаў адукацыі і іншых катэгорый...

На пленуме ішла размова і аб рэферэндуме. Старшыня Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі праінфармавала, што за кароткі перыяд дыялогавыя пляцоўкі для абмеркавання новага праекта Канстытуцыі былі арганізаваны ў 1660 установах адукацыі, а ўдзел у іх прыняла больш як 60 тысяч чалавек. У рамках акцыі «Мы разам за Беларусь» сустрэчы прадстаўнікоў прафсаюза ў калектывах працягваюцца.

**— Падтрымка пенсіянераў, шматдзетных сем'яў, сацыяльна ўразлівых слаёў насельніцтва — гэта своеасаблівая візітка Беларусі,** — падкрэсліла лідар прафсаюза. — **І на маючым адбыцца рэферэндуме мы павінны паказаць такое ж адзінства, якое праявілі пры ўвядзенні заходніх санкцый супраць нашай краіны. Мы поўнасцю падзяляем меркаванне прадстаўнікоў працоўных калектываў аб тым, што толькі грамадзяне нашай краіны, якія працуюць на карысць сваіх сем'яў і сваёй дзяржавы, павінны вызначаць, як і па якіх законах мы будзем жыць заўтра.**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

---

Класныя навіны

# ЛІЦЭЯМ БЫЦЬ!

## Міністэрства адукацыі не плануе іх закрываць

**Як паведаміла начальнік упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Ірына КАРЖОВА, летась, у адпаведнасці з планам работы міністэрства, вывучалася дзейнасць ліцэяў, якія рэалізоўваюць адукацыйную праграму агульнай сярэдняй адукацыі.**

Па выніках праведзенага аналізу і ў мэтах удасканалення іх дзейнасці былі прыняты рашэнні, накіраваныя на недапушчэнне дублявання профіляў у ліцэях, размешчаных у адным горадзе, павышэнне якасці адукацыйнага працэсу ў ліцэях, атрыманне магчымасці навучання ў іх навучэнцам, якія жывуць у сельскіх населеных пунктах, умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы ліцэяў.

У гэтых мэтах былі ўнесены змяненні ў Палажэнне аб установе агульнай сярэдняй адукацыі, дзе вызначаны парадак дзейнасці ліцэяў. Прынята рашэнне праводзіць уступныя іспыты ў 10-я класы ліцэяў у пісьмовай форме, у аднолькавыя тэрміны і па адзіных тэкстах. Дзеля ўстаранення карупцыі пры арганізацыі і правядзенні ўступных іспытаў заданні для іх правядзення будуць распрацоўвацца Рэспубліканскім інстытутам кантролю ведаў.

У ліцэі змогуць быць залічаны навучэнцы, якія здалі ўступныя іспыты на адзнакі, не ніжэйшыя за 6 балаў. Прадугледжана таксама арганізацыя дадатковага прыёму для вучняў, якія не паступілі ў абраны ліцэй, але набралі дастатковую колькасць балаў для паспяховага навучання ў тых ліцэях, дзе ёсць свабодныя месцы.

Ірына Каржова звярнула ўвагу на акаличнасць, што ў Кодэкс аб адукацыі ўнесена нарматыўнае палажэнне, якое абавязвае ліцэі ствараць умовы для пражывання іншагародніх навучэнцаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ЧУЖОЕ СВЯТА

## Як аграсядзібы становяцца прычынай сварак і варожасці паміж суседзямі

**Паняцце «аграэкатурызм» атрымала шырокую вядомасць у нашай краіне ў 2006 годзе. 2 чэрвеня 2006-га быў прыняты Указ № 372 «Аб мерах па развіцці аграэкатурызму ў Рэспубліцы Беларусь».**

Мэтамі, якія ставіла новаўвядзенне, было палепшыць умовы жыцця ў сельскай мясцовасці і ўдасканаліць сельскую інфраструктуру шляхам стварэння падатковых ільгот (тады збор складаў 1 базавую велічыню ў год, з 01.01.2022 да 31.12.2022 ён устаноўлены ў памеры 31 рубель у каляндарны месяц за кожную аграэкасядзібу) для людзей, якія пастаянна пражываюць у сельскай мясцовасці і вядуць асабістую падсобную гаспадарку або сялянска-фермерскую гаспадарку. Паводле задумкі, сельскія населеныя пункты такім чынам вырашаюць праблему недахопу працоўных месцаў, а вёскі ажываюць. Так пачалася гісторыя аграэкатурызму ў Беларусі. Але мяркуючы па зваротах чытачоў, у гэтай добрай справе, як, дарэчы, і ва ўсякай, ёсць свае падводныя камяні...

### ШТО КАЖУЦЬ СУСЕДЗІ

— Паўтару першапачатковую фармулёўку: «...для людзей, якія пастаянна пражываюць у сельскай мясцовасці і вядуць асабістую падсобную гаспадарку». Гэта «і» было найважнейшым, — кажа жыхар вёскі Юхнаўка Каладзішчанскага сельсавета Сяргей Каралёў. — Менавіта гэта «і» робіць магчымым развіццё аграэкатурызму — часовага знаходжання гараджан у сельскай мясцовасці ў мэтах адпачынку, аздараўлення, азнаямлення з прыродным патэнцыялам краіны, нацыянальнай культурай і традыцыямі.

Паступова ў першапачатковую фармулёўку ўказа ўносіліся змены, патрабаванні да ўладальнікаў аграсядзіб станавіліся мякчэйшымі.

— Згодна з бягучай рэдакцыяй указа, любы ўладальнік прыватнага дома, размешчанага на ўчастку, прызначаным для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома, можа стаць суб'ектам аграэкатурызму, выконваючы пры гэтым толькі адно фармальнае патрабаванне: на ўчастку павінна расці хоць бы адна адзінка сельскагаспадарчай расліны. З указа знікла важнае «і», якое дае права стаць аграсядзібай толькі тым, хто вядзе асабістую падсобную гаспадарку. Між тым менавіта зямля, «агра», з'яўляецца асновай для дасягнення мэт такога турызму, — падкрэслівае Сяргей Міхайлавіч.

Ён кажа: у выніку дзейнасць многіх у гэтай сферы зводзіцца толькі да здачы ўнаём сваёй загараднай нерухомасці для правядзення вечарынак.

— Як вынік — шумныя кампаніі замест гасцініц і рэстаранаў (якія плацяць высокія падаткі) пацягнуліся ў падобныя аграсядзібы, што не плацяць у бюджэт практычна нічога з немалых даходаў ад сваёй дзейнасці, не выконваюць санітарных і тэхнічных патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да сапраўдных гасцініц і рэстаранаў.

### НЯПРОСТАЕ СУСЕДСТВА

— З вясны мінулага года ў мяне за плотам функцыянуе такая аграсядзіба. То-бок проста прыватнае домаўладанне — дом, які суседка здае пасутачна кампаніям, што выязджаюць за горад з размахам адпачыць: папарыцца ў лазні, выпіць, пакрычаць... Уся мая сям'я вымушана жыць у атмасферы няспыннага «чужога свята». Я не хачу, каб мае дзеці слухалі песні з нецэнзурнай лексікай, п'яныя крыкі, мат з суседняга ўчастка. Пры гэтым сама суседка, гаспадыня аграсядзібы, на час пражывання «агратурыстаў» пераходзіць жыць у свой другі дом, меншы, за 300 метраў ад асноўнага дома, што дазваляе ёй пераждаць у цішыні гасцяванне шумнай кампаніі. Але як жа так? Згодна з артыкулам 734 Грамадзянскага кодэкса РБ, выканаўца абавязаны аказваць паслугі асабіста, калі іншае не прадугледжана дагаворам аказання паслуг (а тыпавым дагаворам на аказанне паслуг у сферы аграэкатурызму іншае не прадугледжана). Як жа тады ўладальніца аграсядзібы аказвае паслугі асабіста, калі яна папросту адсутнічае ў сваім доме, які аддала цалкам для пражывання аграэкатурыстаў на працягу 24 гадзін? — здзіўляецца Сяргей Міхайлавіч.

Такое суседства і днём не дастаўляе радасці, але асабліва складана бывае па начах, дзеліцца суразмоўца.

— Уначы людзі павінны мець права на спакойны сон. Але суседскі дом не спіць мінімум да трох гадзін ночы, а часам і пазней чуваць шум і музыку. У стане п'янага чаду моладзь, якая прыехала «адарвацца», у гадзіну ночы скача ў яму з вадой, крычаць матам на ўсю акругу, каб чулі дзясяткі суседзяў, якая выдатная, на іх думку, вада ў гэтай яме. Затым, калі не хапіла дроў для лазні, чуваць удары сякеры, бо ў гадзіну ночы, калі нармальныя людзі спяць, кампаніі абавязкова трэба папарыцца. І ўсё гэта — уперамешку з танцамі, песнямі, гучнай музыкай. Хіба для гэтых мэт ствараўся ўказ?

У людзей з розных населеных пунктаў Беларусі, якім не пашанцавала мець у суседзях падобную сядзібу, ёсць агульны чат, кажа Сяргей Міхайлавіч. І яго сітуацыя, аказваецца, яшчэ не самая складаная.

— Людзі сутыкаюцца з гэтым пастаянна. Напрыклад, Валянціна з вёскі Пекары Гродзенскай вобласці распавяла пра тое, што не можа спаць па начах, таму што па суседстве ніколі не спыняецца свята. З-за гэтага ў яе праблемы са здароўем — не раз даводзілася выклікаць «хуткую дапамогу». Заснуць у яе атрымліваецца толькі ў 3-4 гадзіны ночы, а ў 6 раніцы яна ўстае на работу. У выніку жыве на таблетках.

А ў Таццяны Казаковай, якая пражывае ў аграгарадку пад Мінскам, па суседстве — аграсядзіба, якая спецыялізуецца на карпаратывах і вяселлях.

— У прыбудове да дома размяшчаецца банкетная зала, якую госці і вядучы вяселля называюць «рэстаранам». На сёння гаспадыня гатовая прымаць на ўчастку ў 14 сотак кампаніі па 100—150 чалавек, — кажа Таццяна. — Наогул, аграэкатурызм — справа добрая. Людзі прыязджаюць сем'ямі паесці хатнюю ежу, адпачыць, акунуцца ў сельскі каларыт. Але ж тут — зусім іншае. У аграсядзібу прыязджаюць госці, запрошаныя на вяселле, карпаратывы, банкеты, — якія яны аграэкатурысты? Пры правядзенні вяселляў не ўлічваюцца нацыянальныя культурныя традыцыі, не праводзіцца знаёмства з абрадамі, звычаямі беларускага народа.

На суботу і нядзелю, распавядае жанчына, яе сям'я вымушаная з'язджаць з уласнага дома.

На ўсе просьбы суседзяў «быць трохі цішэйшымі» ў іх жалезныя аргументы: «У нас свята!», «Мы заплацілі» і «Мы на прыродзе». Выходзяць ноччу на вуліцу з мікрафонам, ладзяць салюты...

Са слоў суразмоўніцы, найбольшая актыўнасць на суседскім участку прыпадае на вечар пятніцы і выхадныя, але вяселлі людзі праводзяць і ў будні дні, уключаючы нават панядзелак.

— Сёння ў Беларусі каля 3000 аграэкасядзіб. Іх колькасць пастаянна расце. І прырастае яна ў асноўным за кошт падобных «устаноў», — кажа Сяргей Каралёў. — А людзі, якія жывуць па суседстве, замест нармальнага жыцця вымушаны пісаць скаргі і пастаянна звяртацца ў розныя інстанцыі. Мы хочам спакойна жыць у сваіх дамах, не выклікаць міліцыю па начах і не хадзіць з нагоды такога суседства па судах. Хочам, каб нашы дзеці раслі ў здаровым асяроддзі, без нецэнзурнай лаянкі і сузірання распіцця спіртнога за плотам. Хочам, каб развіваліся правільныя суб'екты аграэкатурызму, якія адраджаюць духоўныя і культурныя традыцыі нашай краіны.



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Такімі, што не маюць дачынення да аграэкатурызму, называюць падобныя сядзібы і некаторыя ўладальнікі аграсядзіб (тыя, хто лічыць, што засталіся ў рэчышчы першапачатковай ідэі). Напрыклад, уладальнік аграэкасядзібы «Хутар Ёдзішкі» Андрэй Абрамаў, які падпісаў калектыўны зварот на імя Старшыні Савета Рэспублікі аб неабходнасці ўнясення змяненняў у апошнюю рэдакцыю Указа «Аб развіцці аграэкатурызму».

### ІНШЫ БОК ПЫТАННЯ

Праблема ўзаемаадносін з суседзямі набалелая і для ўладальнікаў аграсядзіб. Не ўсе з іх гатовыя гаварыць пра гэта з прэсай, але Святлана, гаспадыня адной з аграсядзіб пад Мінскам, пагадзілася.

— На працягу двух з паловай гадоў у мяне сапраўды ідзе сур'ёзная барацьба з суседзямі насупраць, — распавядае яна. — Яны нават усталявалі на сваім плоце камеры, каб пастаянна назіраць за тым, што адбываецца на маёй тэрыторыі. Мая аграсядзіба працуе ў нашым аграгарадку 15 гадоў, і нікому ў пасёлку не замінала. І толькі калі ў доме насупраць з'явіліся новыя гаспадары, раптам паўстала пытанне аб тым, што мы — «парушальнікі спакою». Лічу, што гэта элементарная зайздрасць. Каб яны пакаштавалі майго «хлеба» — я маю на ўвазе працу ўладальнікаў аграсядзібы, — думаю, ім не было б калі лічыць чужыя прыбыткі і думаць аб тым, чым займаюцца суседзі.

За гэтыя два з паловай года, распавяла Святлана, яна прайшла праз усе магчымыя праверкі.

— Дзейнасць аграсядзібы правяралі і Міністэрства спорту і турызму, і прадстаўнікі Міністэрства аховы здароўя, і МНС, і энерганагляд. Усю маю сям'ю некалькі разоў правярала падатковая інспекцыя, таму што суседзі пісалі скаргі ў вышэйшыя інстанцыі, што мы жывём не па сродках. І ні адна камісія не знайшла парушэнняў у нашай рабоце. Мы працуем строга ў межах закона. Але суседзям перашкаджае ўсё: і тое, што да мяне прыязджаюць людзі з сем'ямі, і тое, што дзеці маіх гасцей бегаюць па вуліцы, і, зразумела, рэгістрацыя шлюбаў (падчас рэгістрацыі яны спецыяльна разводзяць на сваім участку вогнішчы, каб дым перашкаджаў гасцям). З мэтай перашкодзіць маім гасцям суседзі менавіта падчас мерапрыемстваў у аграсядзібе пачынаюць на сваім участку пілаваць дрэвы, спецыяльна выносяць з дому калонкі, ставяць да майго плота і ўключаюць гучную музыку і нават стукаюць па маім плоце малатком. У дагаворы, які запаўняюць нашы госці, прапісана, што на маім участку па-за межамі дома яны могуць знаходзіцца да 22.00. І я сачу за захаваннем гэтага пункта асабліва старанна, але суседзі ўсё роўна скардзяцца, што аграсядзіба перашкаджае ім спаць.

Святлана расказала, што, стаміўшыся ад гэтага супрацьстаяння, прапанавала суседзям падпісаць міравое пагадненне, дзе яны маглі б выказаць свае патрабаванні, а яна — свае, але апаненты на кампраміс не пайшлі.

— Што датычыцца недастатковага заглыблення ў нацыянальны і сельскі каларыт, дык і гэтыя прэтэнзіі (а іх агучваюць мае суседзі) не абгрунтаваныя: мы прапануем гасцям і лазню з венікамі, і хатнюю кухню з беларускімі стравамі, і рыбалку ў сажалцы на тэрыторыі аграсядзібы. У нас праходзіў прысвечаны Мулявіну анлайн-канцэрт ансамбля «Песняры». На маім участку ёсць і парнікі, і хатняя птушка — куры, качкі. Дарэчы, мы, як аграэкасядзіба, маем права на вытворчасць аўтэнтычных алкагольных напояў — не для продажу, а для пачастунку гасцей. Але наша аграсядзіба гэтым правам не карыстаецца. А пытанне аб стварэнні працоўных месцаў... Мы, сапраўды, не прыцягваем работнікаў збоку. Але ў нас шматдзетная сям'я, і ўсе чатыры пакаленні працуюць на нашай аграэкасядзібе. Прэтэнзія, што ўладальнікі сядзібы не пражываюць на тэрыторыі свайго загараднага дома і не вядуць гаспадарку, у нашым выпадку не правамерная. І ўсе гаспадары аграэкасядзіб, з кім я маю зносіны, менавіта пражываюць і працуюць на зямлі. Здача катэджаў на суткі — гэта зусім іншы від дзейнасці.

### ЦІ ЁСЦЬ РАШЭННЕ?

Хваля незадаволенасці дакацілася да Міністэрства спорту і турызму, які курыруе дзейнасць аграэкасядзіб. Сёння рыхтуюцца змены ва Указ № 365, дзейнічае грамадскі савет на чале з намеснікам міністра спорту і турызму Міхаілам Партным.

*— Найважнейшай умовай дзейнасці ў сферы аграэкатурызму стане непасрэднае вядзенне асабістай падсобнай гаспадаркі (для фізічных асоб), вытворчасць сельгаспрадукцыі (для сельскагаспадарчых арганізацый). Дадзены від дзейнасці ў першую чаргу павінен датычыцца працы на зямлі і вытворчасці сельгаспрадукцыі, з прычыны чаго будзе магчымы прыём гасцей,* — кажа **галоўны юрысконсульт Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Аляксандр КРЭЧАТАЎ.** — *Сёння апрацоўка зямлі і вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі ўспрымаюцца асобнымі гаспадарамі аграэкасядзіб як другарадная дзейнасць, і часта гэта робіцца толькі «пад птушачку». Часам на ўчастку расце толькі адно дрэва, але «птушачка» пастаўлена, умова выканана. У выніку ні аб якім заглыбленні ў атмасферу вясковага побыту гаворкі не ідзе. Калі праект указа будзе падтрыманы, таксама скарэкціруецца пералік паслуг, якія аказваюцца аграэкасядзібамі, каб максімальна азнаёміць аграэкатурыстаў з этнічнай і культурнай спадчынай нашай краіны, акунуць у сельскі побыт, а не перанесці горад у вёску, як гэта назіраецца пры арганізацыі звычайнага вяселля на асобных аграэкасядзібах. Незадавальненне суседзяў тут зразумелае: яны маюць права на адпачынак, але з прычыны шуму ўзнікае моцны дыскамфорт.*

*Праектам таксама прадугледжваецца патрабаванні да памераў зямельнага ўчастка аграэкасядзібы — не менш чым 0,15 га. Абмежаванняў па колькасці прыманых аграэкасядзібай гасцей не будзе — такія абмежаванні могуць часова паўстаць толькі як патрабаванні санітарна-эпідэмічнага характару.*

Ці вырашыць новая рэдакцыя ўказа набалелае пытанне ўзаемаадносін уладальнікаў аграэкасядзіб з аднавяскоўцамі?

— Мы імкнёмся ўлічыць інтарэсы абодвух бакоў, — падкрэслівае Аляксандр Крэчатаў. — У рабоце грамадска-кансультатыўнага савета, на разгляд якога выносіўся праект указа, прымалі ўдзел і людзі, якія пражываюць побач з аграэкасядзібамі, і самі ўладальнікі аграэкасядзіб, і прадстаўнікі грамадскага аб'яднання «Адпачынак у вёсцы». Але вельмі многае будзе залежаць таксама ад чалавечага фактару, ад жадання людзей ісці на кампраміс.

Ці магчымы гэты кампраміс, пакажа будучыня.

— Я, а таксама тыя, хто, як і я, пражываюць па суседстве з падобнымі аграсядзібамі, бачым выхад з сітуацыі, якая склалася, праз унясенне наступнай змены ва Указ Прэзідэнта № 365 «Аб развіцці аграэкатурызму»: кожны саіскальнік на атрыманне статусу суб'екта аграэкатурызму перад пачаткам сваёй дзейнасці павінен атрымаць натарыяльна завераны дазвол суседзяў, дамы якіх размяшчаюцца на адлегласці менш за 100 метраў ад дома, у якім будуць пакоі для пражывання аграэкатурыстаў. Гэтая фармулёўка вырашыць адразу дзве праблемы — і з шумамі, якія замінаюць жыць суседзям, і з дасягненнем мэт і задач указа. Бо тады аграсядзібы будуць размешчаны на вялікіх участках, уладальнікі якіх вядуць сваю прысядзібную гаспадарку, — кажа Сяргей Каралёў. — Ну якая аграсядзіба ў атачэнні суседскіх дамоў? Гэта проста лёгкі шлях зарабіць у беспадаткавым асяроддзі.

Святлана, гаспадыня аграсядзібы, перакананая: калі казаць пра канфлікты з суседзямі, тут справа не ў недапрацоўках заканадаўства, а ў элементарных законах добрасуседства.

Плануецца, што змены ўступяць у сілу 1 студзеня 2023 года. Ці змогуць яны пакласці канец супрацьстаянню? Мае суразмоўцы спадзяюцца, што так. Але пакуль ім застаецца толькі чакаць...

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# СВЕЦЕ МОЙ

*Жыццё, жыццё... Не першы, не апошні...*
*Вось і разваж, дзе блазен, дзе герой,*
*Калі з гары ўпрагаўся ў воз парожні*
*І пеклаваўся з грузам пад гарой.*

**Так калісьці напісаў Міхась Стральцоў, які дагэтуль застаецца адной з самых прыцягальных і загадкавых постацяў беларускай культуры... Сярод напісанага ім — неверагодна шчымлівае і захапляльнае эсэ «Загадка Максіма Багдановіча». І цяпер, калі Міхасю Стральцову споўнілася б 85 гадоў, самы час паспрабаваць разгадаць загадку яго самога. У гэтым нам дапамогуць намеснік дырэктара выдавецтва «Мастацкая літаратура» — галоўны рэдактар часопіса «Полымя», паэт Віктар ШНІП, намеснік дырэктара канала «Культура» Беларускага радыё, паэт Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ, галоўны навуковы супрацоўнік аддзела тэорыі і гісторыі літаратуры Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Яўген ГАРАДНІЦКІ, пісьменнік, перакладчык, краязнаўца Анатоль БУТЭВІЧ, паэт Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК, пісьменніца Ксенія ШТАЛЯНКОВА.**

***— «Нават на фоне свайго пакалення, якое называлі філалагічным, Міхась Стральцоў вылучаўся...» — сцвярджаў Пятро Васючэнка. Чым менавіта вылучаўся?***

**В. Шніп:** Міхась Стральцоў сярод свайго пакалення вылучаўся тым, што не імкнуўся да высокіх пасад. І, нават працуючы загадчыкам аддзела мастацтва, крытыкі і бібліяграфіі часопіса «Нёман», ён заставаўся Чалавекам і Паэтам, які задавальняўся цыгарэтным дымам, а не фіміямам.

**А. Бутэвіч:** Вызначаўся своеасаблівым, толькі яму ўласцівым, стылем, манерай пісьма, якой валодалі нямногія, надзвычайнай чуйнасцю да слова. А таксама пастаяннымі пошукамі. Нездарма ён часта быў і першапраходцам, і першаадкрывальнікам. Захаплялі яго інтэлектуальныя здольнасці, увага да душэўнага і духоўнага стану герояў, здольнасць перадаць гэта самым звычайна-натуральным чынам. Хіба не пра гэта яго радкі:
*Яно, канечне, слова — лекі:*
*Дык што ж — узяў і прапісаў?*
*А што, як скажуць чалавекі:*
*Мой лекар, вылечыся сам.*

**Я. Гарадніцкі:** Як бывццам, найперш відавочнай адметнасцю яго мастацкага стылю ці не аднадушна прызнаецца «лірызм», а сам ён залічваецца да самых яскравых прадстаўнікоў так званай лірычнай прозы. Аднак такое вызначэнне занадта шырокае. Лірызм у прозе і эпічнасць у паэзіі могуць выяўляцца ў розных формах. У выпадку Стральцова лірызм як аўтарская самавыяўленне дапаўняецца тонкім псіхалагізмам, самараскрыццём асобы, выказаным сродкамі апавядальніцкага майстэрства. Адчувальныя ў кожным сказе і кожным слове стылёвая паўната і завершанасць, глыбінная сувязь стылю з рэальнасцю герояў — тое, чым пазначаны талент Стральцова, ягоная «пячатка майстра».

**Н. Гальпяровіч:** Нейкім надзвычай тонкім лірызмам, прыхаваным гумарам, паглыбленасцю ва ўнутраны свет герояў, бо пачынаў з прозы; глыбокай інтэлігентнасцю, за якой бачылася высокая адукаванасць і эрудыцыя. Ён пазбег традыцыйнай тады для многіх яго равеснікаў узнёсласці і пафасу.

**К. Шталянкова:** На маю думку, як прадстаўніцы пакалення 1990-х, ужо зусім далёкага ад Міхася Стральцова, ён вылучаўся і вылучаецца па сёння вельмі сучасным, актуальным пісьмом. Падаецца, ну вось жа ён пісаў столькі дзесяцігоддзяў таму, але ж нейкім чынам яго словы пранізваюць час, і я разумею, што вось зараз адчуваю тое самае, пра што пісаў ён. Гэта нейкае дзіўнае ўменне зафіксаваць шчырасць моманту. Мне хочацца думаць, што такая ўдача даступная тым, хто не хлусіць у творчасці, бо на такое здатныя тым, хто не хлусіць сабе. Хоць гэта, натуральна, толькі маё ўяўнае, магчыма, Стральцоў быў проста геніем.

**Л. Дранько-Майсюк:** Не рабіў кар'еру і ўмеў двума-трыма словамі (скупа, але шчыра!) пахваліць іншага пісьменніка. Сапраўды, хваліў скупа, але запамінальна. У якасці прыкладу згадаю запіс са сваёй «Памятнай кніжкі»:

*«Міхась Стральцоў заходзіць у рэдакцыю, і я, бліснуўшы каляровай вокладкай, разгортваю перад ім сігнальны экзэмпляр штогодніка «Дзень паэзіі — 84», — там вельмі цікавы артыкул Алеся Разанава пра творчасць Францішка Багушэвіча.*

*Закурыўшы, Стральцоў чытае, глыбока зацягваецца дымам, левай далонню міжвольна пагладжвае разгорнуты штогоднік; артыкул Стральцову падабаецца, ад непрытушанага недакурка ён прыкурвае новую цыгарэту, зноў паглыбляецца ў чытанне, у ягоную рэшту, а тады пачынае хадзіць па рэдакцыйным пакоі і ў цыгарэтным дыме з нейкай мілай дзіцячай невыразнасцю ў голасе двойчы, нібыта самому сабе, гаворыць пра Алеся Разанава:*

*— Умее думаць... Умее думаць...»*

***— Хто ў першую чаргу Міхась Стральцоў — паэт, празаік альбо літаратуразнаўца?***

**В. Шніп:** Міхась Стральцоў у першую чаргу — Паэт. І ён быў паэтам і ў прозе, і ў літаратуразнаўстве, і ў сваім маўчанні. Таму што сапраўдны Паэт, што б ні пісаў, ні рабіў, усюды будзе заставацца паэтам. І ў Стральцова гэтае паэцтва было натуральным, бескантрольным і бязмаскавым. Ён быў самотны, як Максім Багдановіч.

**Я. Гарадніцкі:** Прыгадваецца сяброўская эпіграма Савося Авося (Рыгора Барадуліна) менавіта пра гэтую *трохіснасць* або *трохаблічнасць* Стральцова.
*За Гамера спрачалася сем гарадоў.*
*Тры секцыі —*
*за Міхася Стральцова:*
*Крытык Стральцоў,*
*Празаік Стральцоў*
*Ці лірык Стральцоў?*
*За вечнасцю слова.*

З гледзішча вечнасці мінула не так шмат часу, каб ставіць кропку ў гэтай спрэчцы. На маю думку, ён раўназначны ва ўсіх трох іпастасях. Таму не магу пагадзіцца з даволі пашыраным меркаваннем, што Стральцоў найперш празаік. І паэзія наша не можа ўжо абысціся без стваранага Стральцовым-паэтам, пранікнёным лірыкам, які ўзбагаціў яе тонкім псіхалагізмам экзістэнцыяльных адчуванняў.



**А. Бутэвіч:** Умець убачыць сапраўднае, натуральнае жыццё, заўважыць яго сутнасць і спакойна, без надрыву і крыку ўвасобіць у нешматслоўныя творы з цікавымі і жыццёва праўдзівымі героямі ўдаецца не кожнаму. І яшчэ — я з асаблівай цікавасцю згадваю яго літаратуразнаўчыя памкненні, дзе ён таксама выявіў сябе таленавітым творцам. Асабліва зачапіла мяне эсэ «Загадка Багдановіча». Чытаў не раз.

Стральцоў умела і займальна, мо як ніхто, паказваў жыццёвую повязь вёскі — горад. Згадаем яго «Сена на асфальце». Мо таму, што сам я зусім нядаўна, калі жыў на нясвіжскім хутары, чуў гэты зачараваўны пах на нашай хутарской бязмежнасці, і так хацелася не забыцца на яго, не выкінуць з душы ўсё тое нядаўняе, натуральна-непаўторнае сярод мінскіх шматпавярховікаў і на сталічным асфальце. Таму вясковая прывязанасць Стральцова была мне блізкай і зразумелай. А яшчэ таму, што там была самая сапраўдная жыццёвая, вясковая праўда.

**Н. Гальпяровіч:** Цяжка адназначна сказаць, але мне здаецца, што ва ўсіх гэтых іпастасях ён у першую чаргу паэт. Паэзія прысутнічае і ў яго прозе, і ў літаратуразнаўчых працах.

**Л. Дранько-Майсюк:** Перш за ўсё ён творца, чыя музыка дае асалоду:

*«...А лодачка ўсё плыла і плыла, сінела чыстае і спякотнае неба, усё раслі і раслі на гарызонце белыя горы, і нейкі Поль вычытваў з газеты пра снежныя абвалы ў горных вёсках з дзіўнымі назвамі Пірале, Дамонта, К'ябрана, Вальпрата.*

*А потым лодачка павярнула назад, і ўсё бліжэй і бліжэй бераг, і не было ўжо відно высокіх гор, і неўзабаве не было ўжо нічога, акрамя горада і сіняга мора, і ўсё плыла, плыла па дрымотнай вадзе лодачка, слаўная лодачка з сіняй аздобкай уздоўж борта...»*

Што гэта?

А гэта харство беларускага стылю!

Гэта Міхась Стральцоў — паэт, празаік, літаратуразнаўца!

**К. Шталянкова:** Для мяне — эсэіст. Бо гэта менавіта тое, чым ён адрозніваецца ад шэрагу іншых літаратараў свайго часу. Беларуская літаратура славіцца паэзіяй, у пасляваенны перыяд з'яўляюцца выдатныя празаікі, але ж пісаць штосьці на мяжы жанраў, адначасова шчодра дзелячыся сваім эмацыйным перажываннем і абрамляючы гэта не ў вершаваную форму, а такі тэкст, што, можа падасца, я магу пачуць ад рэальнага жывога чалавека, які не кідае ў вочы сваё пісьменства, а проста прамаўляе, — вось гэта ўнікальная стральцоўская ніша.

***— Успомніце ўражанне ад першай сустрэчы з Міхасём Стральцовым — ці асабістай, калі яна была, ці ад знаёмства з яго творчасцю.***

**В. Шніп:** Да Міхася Стральцова ў «Нёман» я прыйшоў, калі ўжо меў кніжку «Гронка святла». Гэта быў 1984 год. У мяне сабралася вершаў на другую. Мая першая кніжка цалкам складалася пад настаўніцтвам Рыгора Барадуліна. І ў размовах з Рыгорам Іванавічам я нярэдка чуў імя Міхася Стральцова, чый «Ядлоўцавы куст» быў адной з маіх любімых кніг. І ў «Нёман» да Міхася Лявонавіча я прынёс рукапіс будучай кнігі «Пошук радасці». Стральцоў, даведаўшыся, з чым я прыйшоў, мог бы адправіць мяне ў «Мастацкую літаратуру», і на гэтым наша знаёмства закончылася б. Але Міхась Лявонавіч даўно ўжо быў знаёмы з маімі вершамі ў друку, таму абрадаваўся майму прыходу. Распытаўшыся пра жыццё-быццё, ён папрасіў схадзіць праз дарогу да газетнага кіёска і набыць яму цыгарэт. Даў грошы. І пакуль я хадзіў па цыгарэты, Міхась Лявонавіч паспеў прачытаць дзесятак маіх вершаў. Пакурыўшы на ганку рэдакцыі і вярнуўшыся ў кабінет, Стральцоў стаў чытаць уголас рукапіс маёй будучай кнігі і гаварыць пра якасць кожнага радка. Тлумачыў, чаму тут добра, чаму тут выдатна, а чаму тут кепска і чаму гэты верш трэба аддаць паэту (ён называў прозвішча паэта, якога я добра ведаў) і больш так не пісаць. Некаторыя радкі ў вершах мы з Міхасём Лявонавічам тут жа правілі. Я прыдумляў варыянты, а ён іх зачытваў. Правяраў на вобразнасць, на сэнс і на гучанне. І ўсе вершы маёй новай кніжкі «Пошук радасці», якая выйшла ў 1987 годзе, былі цалкам па некалькі разоў прапушчаны праз душу і сэрца Міхася Стральцова. Словам, два гады перад ад'ездам на вучобу ў Літінстытут на ВЛК я хадзіў у школу Міхася Стральцова.

**А. Бутэвіч:** Відаць, адметная сустрэча з «Загадкай Багдановіча», якая адбылася тады, калі я быў студэнтам філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта. Нават мой літаратурны псеўданім пазней быў пазначаны пячаткай Багдановіча — Максім Валошка.

**Я. Гарадніцкі:** Адзіная сустрэча з Міхасём Стральцовым, падчас якой давялося з ім паразмаўляць, была ўвогуле выпадковай і нечаканай. Стаяла лета 1969 года. Я скончыў школу і працаваў на Мінскім заводзе запчастак фрэзероўшчыкам. Напярэдзе былі ўступныя іспыты на філфак БДУ. Жыў я тады на кватэры па вуліцы Чарвякова. Аднойчы вырашыў схадзіць у кінатэатр «Спартак», які быў непадалёку. Да пачатку сеанса яшчэ заставалася трохі часу. Непадалёк ад будынка кінатэатра быў газетны кіёск, у якім я купіў свежы нумар часопіса «Полымя». Сеўшы на лаўку побач з кінатэатрам, пачаў разглядаць часопіс. Гэта быў шосты нумар за 1969 год, і, памятаю, мяне найперш зацікавіў нарыс Янкі Сіпакова «Акно, расчыненае ў зіму». Унураны ў часопіс, я ўсё ж краем вока заўважыў, што на другім краі лаўкі прысеў мужчына і запаліў цыгарэту. Праз нейкі час ён пачаў гаворку, патлумачыўшы, што яго зацікавіла тое, што я чытаю беларускамоўны часопіс. Маўляў, рэдкая з'ява, каб гарадскі хлопец так вось, седзячы на лаўцы, чытаў штосьці пабеларуску. Спытаў, хто я і адкуль родам? Я адказаў, што з Ракава. Міхась Стральцоў, а ён назваў сябе, тут жа згадаў вядомага ўжо на той час ракаўца — Вячаслава Рагойшу. Наогул, размова наша была нядоўгай, хутка пачынаўся сеанс у кінатэатры, на які ў мяне быў квіток. Памятаю яшчэ, што Стральцоў параіў мне звярнуць увагу на «Песню пра зубра» Міколы Гусоўскага, пераклад якой быў якраз надрукаваны ў чэрвеньскім нумары «Полымя».

У далейшым толькі двойчы бачыў Стральцова, і тое наводдаль. На пасяджэнні літаб'яднання пры «Чырвонай змене», на якое ён, мабыць, выпадкова завітаў разам з Міколам Федзюковічам і Яўгенам Крупенькам. І за сталом у рэдакцыі «Нёмана», куды я зайшоў да Алы Сямёнавай, якая рэдагавала маю рэцэнзію на апошнюю кнігу паэзіі Караткевіча.

Тры сустрэчы. І тры розныя вобразы Стральцова, захаваныя ў маёй памяці, адпаведна этапам ягонага няпростага жыцця. Малады, поўны спакойнай і ўпэўненай творчай моцы. У час крызісу. І ў апошні год жыцця, схілены ў элегічным роздуме над пісьмовым сталом.

**Н. Гальпяровіч:** Беражна захоўваю маленькую кніжачку прозы Стральцова «Адзін лапаць, адзін чунь» з дарчым надпісам «Навуму ад аднаго лапця і ад аднаго чуня». А асабістая сустрэча ў Полацку натхніла мяне пазней на цэлую навелу. Так сталася, што падчас яго паездкі па лініі бюро прапаганды Саюза пісьменнікаў мне давялося пабыць з ім у кампаніі сяброў цэлы вечар у гасцінічным нумары. Мы гаварылі пра літаратуру. Міхась Лявонавіч успамінаў пра свае сустрэчы з Васілём Шукшыным, маскоўскімі паэтамі, з павагай і цеплынёй адгукаўся пра сваіх аднакурснікаў Рыгора Барадуліна, Васіля Зуёнка, Сымона Блатуна.

Мы разам з Германам Кірылавым, з якім прыйшлі ў гасцініцу, праводзілі Міхася Лявонавіча і яго спадарожніка Міколу Маляўку на вакзал. Поезд на Мінск адпраўляўся ў гадзіну ночы. Увесь час па дарозе і на пероне вакзала Стральцоў чытаў вершы. Не свае, мы яшчэ не ведалі пра яго паэтычную творчасць. Любімых ім

# ЯСНЫ...

## Загадка Міхася Стральцова

Забалоцкага, Смелякова, Сакалова, Пастарнака. Мяне тады уразіла, колькі ён ведае на памяць паэтычных радкоў, як можа прыгожа і ўзнёсла чытаць паэзію.

Пасля гэтай было яшчэ некалькі сустрэч, калі Стральцоў прыязджаў разам з Барадуліным у Полацк.

А што датычыцца знаёмства з яго творчасцю, то, наколькі я памятаю, уразіў мяне ў маладосці яго шэдэўр — «Смаленне вепрука». Не адзін дзень хадзіў пад уражаннем гэтага апавядання.

**Л. Дранько-Майсюк:** Я не застаўся жыць у Маскве. Імкнуўся ў Мінск. Хацеў пазнаёміцца з Міхасём Стральцовым. Сустрэча адбылася ў апошнія дні вясны 1981 года ў выдавецтве «Мастацкая літаратура». Пагаварылі ў рэдакцыі паэзіі. Тады сабраліся ў горад. Стральцоў папрасіў: «Давай не ў ліфце, а спусцімся па сходах!» І з дзявятага паверха мы сышлі ўніз па сходах. Гэта запомнілася!

**К. Шталянкова:** Маё першае знаёмства з творчасцю Стральцова адбылося ў школе, бо ў праграму 11 класа было ўключана «Сена на асфальце». Я памятаю, што нас прымушалі немаведама навошта вучыць фрагмент пра самалёт (для мяне ўвогуле таямніца, навошта вучыць прозу на памяць замест таго, каб пісаць уласныя тэксты-водгукі, напрыклад). Мне той фрагмент падаваўся абсалютна ніякім, але ж, калі я прачытала ўвесь тэкст, мяне зачапіла, зноў жа такі, як ён фіксуе момант, эмацыянальны стан, шчырасць адчуванняў і чаканняў. Як апісвае дзеянне — па-журналісцку лаканічна, але ж у гэтым не было сухасці, гэта быў жывы тэкст, амаль дзённік. Гэта было нешта сапраўднае, заціснутае паміж абавязкаў вучыць і здаваць тэксты на памяць.

***— Які твор Міхася Стральцова для вас самы знакавы?***

**В. Шніп:** Адзін твор вылучыць не магу. Назву кніжкі, якія для мяне былі і застаюцца падручнікамі па Паэзіі. Гэта «Ядлоўцавы куст» і «Мой свеце ясны». У прозе — «Сена на асфальце».

**А. Бутэвіч:** Безумоўна, «Смаленне вепрука», якое набыло шырокі розгалас. Як і «Сена на асфальце», якое бурліва і зацікаўлена абмяркоўвалася ў нашых студэнцкіх пакоях інтэрната на Паркавай магістралі, 9. Дарэчы, як і іншае, створанае Стральцовым, — разгалоснае «Адзін лапаць, адзін чунь», цікавая для многіх «Загадка Багдановіча». А з паэзіяй Стральцова я пасябраваў па-сапраўднаму пасля яго зборнічка «Мой свеце ясны».

**Я. Гарадніцкі:** Апавяданне «Смаленне вепрука», мабыць, ва ўсіх на слыху, і менавіта яно з'яўляецца як бы візітоўкай пісьменніка. Гэтак сама як у літаратурнай эсэістыцы — «Загадка Багдановіча». Заўважым, што абодва названыя творы навататарскія па сваёй паэтыцы, з імі прыўносілася шмат новага і ў беларускую літаратуру, і ў даследаванне літаратуры. Да іх далучыць варта аповесць «Адзін лапаць, адзін чунь», твор пранізлівы па сваёй інтанацыі і душэўнай пранікнёнасці, у якім з такой неверагоднай мастацкай сілай выяўлена знітаванае пераемнасцю духоўнага досведу жыццё чалавека.

**Н. Гальпяровіч:** Ну, безумоўна, якраз «Смаленне вепрука» і кніга паэзіі «Мой свеце ясны».

**Л. Дранько-Майсюк:** Адказваючы на гэтае пытанне, скарыстаю яшчэ адзін запіс з «Памятнай кніжкі»:

«...23 жніўня 2016 г., аўторак.

З Лагацкім, героем апавядання Міхася Стральцова «Блакітны вецер», рабілася нешта незразумелае, нешта датклiва-няўлыннае — яму, маладому няўдачніку, які не ўмеў «... уладкаваць сваю душэўную гаспадарку...» сніўся... блакітны вецер.

Звычайна ў дзве гадзіны ночы Лагацкі прачынаўся і пачынаў бадзяцца па гарадзе.

Пэўна, з гэтага адчування Міхась Стральцоў выснаваў і вершаваныя радкі:

*Ды скруха скорыцца журбе,*
*Душа ізноў рахманай стане.*
*І твой зласлівец на цябе*
*У неспакоі раптам гляне!..»*

**К. Шталянкова:** Не магу сказаць, што ёсць пэўны твор, які магла б назваць менавіта знакавым як нейкую асобную з'яву ў творчасці Стральцова, бо насамрэч знакавая яго постаць у беларускай літаратуры. Але ж сёння я перачытала яго верш «Так! Пад ценем вясла...», і ён не толькі адгукаецца ў мяне датычна таго, што я думаю і адчуваю сёння, але ж да таго падаецца вельмі нестандартным для беларускай паэзіі, для беларускага пісьма ўвогуле. Каб так думаць і дыхаць, фіксуючы радкі, патрэбна быць напраўду выдатным пісьменнікам. Знакавым.

сур'ёзным стаўленні да свайго паклікання.

**Н. Гальпяровіч:** Гэта добра, што міфалагізуецца. Нам якраз не хапае гэткіх міфаў пра нашых нацыянальных творцаў. Няхай гэта толькі паслужыць таму, што творчасць Стральцова зацікавіць большую колькасць чытачоў. А сярод дэталяў трэба адкінуць толькі празмерную цікавасць да «смажаных» эпізодаў з асабістай біяграфіі Стральцова, бо не гэтым вызначаецца значнасць яго творчай асобы.

**К. Шталянкова:** Постаць Стральцова сапраўды міфалагізуецца ў тым плане, што амаль кожны, хто мае дачыненне да беларускай літаратуры, нешта пра яго чуў. То-бок ёсць нейкі такі Стральцоў, пра якога кожны скажа: «Гэты Стральцоў — ён вось такі і такі, гэта паэт, празаік і эсэіст». Але я не ўпэўнена, што шмат людзей здолее назваць хоць бы пяць яго твораў, не правяраючы ў інтэрнэце. Таму мне хацелася б, каб папулярызавалася не сама постаць Стральцова, а яго творчасць. Але ці патрэбна рабіць з яго творчасці міф, не ўпэўнена. Бо міф — гэта заўжды адмерлае, нежывое, а моц тэкстаў у тым, каб сягаць скрозь час і знаходзіць водгук у чытачоў, якія жывуць пасля смерці аўтара і нічога пра яго дакладна не ведаюць.



Міхась Стральцоў з Рыгорам Барадуліным.

***— Ці можна сказаць, што постаць Міхася Стральцова міфалагізуецца ці, наадварот, ён незаслужана забыты?***

**В. Шніп:** Можа, нехта пра Міхася Стральцова і забыўся, але ад гэтага яго паэзія і проза не губляюць каштоўнасць. Постаць Стральцова паступова міфалагізуецца і паціху становіцца побач з Уладзімірам Караткевічам.

**А. Бутэвіч:** Тое, што Стральцова часам міфалагізуюць, то няхай. Гэта толькі на карысць. Як і іншым творчым людзям, дарэчы. Толькі міфалагізацыя не павінна адпрэчваць і перайначваць альбо закрэсліваць рэальныя жыццёвыя абставіны, няхай сабе мо часам і не надта спрыяльныя. Любы з нас — і ранейшых, і сённяшніх — мае за плячыма розны багаж. Яго не трэба саромецца, не варта выракацца, але і дэманізаваць нешта адно таксама не варта.

**Я. Гарадніцкі:** Пра забыццё такога выдатнага і яскравага майстра беларускага мастацкага слова казаць, напэўна, не выпадае. Ён сам, яго творчы даробак адчувальна прысутныя ў полі беларускай культуры і аказваюць прыкметнае ўздзеянне на сучасны літаратурны працэс. Па сутнасці, перад намі эталон майстэрства, на які варта арыентавацца, хоць перайманць наўрад ці ўдасца. Прыклад таго, чаго можа дасягнуць талент пры

**Л. Дранько-Майсюк:** Звычайна міф ствараецца яшчэ пры жыцці асобы з частых размоў пра яе. Неаднойчы я загаворваў з нашымі (і маскоўскімі!) літаратарамі пра аўтара «Загадкі Багдановіча». Напрыклад, вёў такія бяседы з Міхалам Дубянецкім.

І тут, спадзяюся, дарэчы будзе і такі мой запіс з той жа «Памятнай кніжкі»:

«(...) аднойчы з намерам я купіў стральцоўскі зборнік і насіў яго з сабой, зноў жа строячы свае летуценныя планы.

«Калі не сёння, то заўтра, ці на тым тыдні сустрэну Міхася і вазьму аўтограф для Дубянецкага! — так надумваў сабе. — А Дубянецкаму скажу, што Стральцоў прасіў перадаць для Вас, Міхал Фёдаравіч, сваю кнігу!»

Стральцоў ішоў па Феліцыянскай.

Так, мы сустрэліся, як мне і хацелася, выпадкова і нават крыху сімвалічна, — убачыліся ля таго несамавітага шынка, што мясціўся паміж кінатэатрам «Перамога» і будынкам школы; у гэтым шынку ў маі 1981-га я ўзяў з ім свае першыя сто грамаў, таму і па сённяшні дзень той, цяпер ужо няісны, пітны дамок, ля ганка якога рос ядловец, жыве ў маёй душы пад невыпадковай назвай «Куст ядлоўцу».

Тады за хісткім столікам, да якога прыліпілі рыбіны косткі,




з намі сядзеў яшчэ і мілы гумарыст Рыгор Яўсееў, і тыя мае першыя з ім сто грамаў былі, дарэчы, і апошнія — больш званіць шклянкамі нам разам не даводзілася.

Па Феліцыянскай мы выйшлі на Нямігу, прыселі на першай пустой лаўцы.

Надпісваючы кнігу, Стральцоў курыў і левай рукой, не выпускаючы пры гэтым цыгарэту, змахнуў з тытульнай старонкі тапалёвую пушынку...

(...) аўтограф Стральцова, хоць і накіданы не вельмі разборлівымі літарамі, Дубянецкаму спадабаўся...

Кнігу Стральцова Дубянецкі далікатна пагартаў, на адну-дзве старонкі, як чарадзей, злёгку прыклаў далонь, прачытаў уголас некалькі радкоў, уважліва агледзеў падарунак, як дарагую шкатулку, і заключыў:

— Стральцоў піша без цыркацкіх падскокаў!..»

***— У чым загадка Міхася Стральцова?***

**В. Шніп:** У чым? А ў тым, у чым загадка Максіма Багдановіча. У Паэтычнасці. У Інтэлігентнасці. У Чуласці. У Любові. У Каханні...

**А. Бутэвіч:** О, каб жа я ведаў.

**К. Шталянкова:** Не ўпэўнена, што ў Стральцова ёсць якая-небудзь загадка. Магчыма, я не настолькі дасканала ведаю яго творчасць, але ж па-мойму галоўнае тут — тое, што ён проста добра пісаў. Не ўдаваў са сваёго пісьма немаведама што, не строіў з сябе ў сваім пісьме немаведама што. А проста пісаў, таму што ўмеў.

**Л. Дранько-Майсюк:** Пра гэта думаю і думаю. Аднойчы склаў невыпадковы для сябе верш, дзе ёсць радкі:

*Багдановіч, пачуй,*
*Як знясіленым лебедзем*
*слова —*
*Беларускае слова! —*
*Над магілаю кружыць*
*Стральцова.*

*Багдановіч, вартуй*
*Кожны крок наш і рух*
*недарэчны...*
*Хай загадка твая*
*Застаецца загадкаю вечнай.*

**Я. Гарадніцкі:** Як і ў яго героя — Максіма Багдановіча, найбольшая загадка Стральцова — у незавершанасці, абарванасці жыццёвага і творчага шляху. Мы не ведаем, нам ніколі не дадзена дазнацца аб тым, што засталося ім няўздзейсненым, у чым мы засталіся назаўжды абдзеленымі.

**Н. Гальпяровіч:** Як і ва ўсіх волатаў прыгожага пісьменства, «пацалаваных Богам». Яны заўсёды — загадка.

Падрыхтавала Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Кінакрокі

# ПОЛЫМЯ ПАД ПОПЕЛАМ

## На тэлеканале «Беларусь 1» — прэм'ера гістарычнай драмы

**Яшчэ восенню «Звязда» распавядала аб новым праекце «Беларусьфільма», які прысвечаны захаванню гістарычнай памяці, вечнай тэме абароны Айчыны. Рэжысёрам-пастаноўшчыкам 8-серыйнай гістарычнай драмы стаў Іван ПАЎЛАЎ. А сама стужка атрымала назву «Полымя пад попелам». Гэта гісторыя аб добраахвотніках ОСОАВИАХИМа — людзях, што займаліся размініраваннем вызваленых ад фашысцкай акупацыі тэрыторый. У серыяле праведзена паралель паміж 1945 годам і сённяшнім днём, бо і цяпер у нашай зямлі засталіся снарады, міны, бомбы з тых трагічных і гераічных часоў і ёсць мужныя людзі, якія займаюцца іх абясшкоджваннем. Таму і здымкі праходзілі адразу ў некалькіх лакацыях: пад Смалявічамі акцёры спрабавалі адлюстраваць мінулае, а вось у адной з мінскіх кватэр здымалі ўжо падзеі нашага часу.**

— Гэты праект запусцілі ў вытворчасць даўно, — распавёў Іван Паўлаў. — Мы доўга працавалі над сцэнарыем. Тэма маладых людзей, якія ў 1945 годзе размініравалі Мінск пасля вайны, мякка кажучы, не вельмі шырока вядомая грамадству. Вядома ж, на фоне ваеннай тэматыкі ў нас будуць разгортвацца і чалавечыя ўзаемаадносіны: у нас ёсць і пра каханне, і пра здраду, і пра смелыя ўчынкі.

Лакальная прэм'ера праекта ўжо адбылася — 31 студзеня ў кінатэатры «Беларусьфільм». Там шматсерыйную стужку ацанілі члены экспертнага савета кінастудыі і здымачная каманда. Але ўсё ж такі калі «Полымя пад попелам» пабачыць звычайны глядач? Адказ на гэтае пытанне «Звяздзе» далі ў прадзюсарскім цэнтры «Беларусьфільма». Прэм'ерны паказ адбудзецца 22 лютага на тэлеканале «Беларусь 1». Кожны дзень гледачоў будзе чакаць дзве новыя серыі гістарычнай драмы — такім чынам, 25 лютага стане апошнім днём трансляцыі серыяла. Але нам паведамілі, што потым «Полымя пад попелам» будуць паказваць на тэлеканале «Беларусь 3».

**Дырэктар кінастудыі «Беларусьфільм» Уладзімір КАРАЧЭЎСКІ** адзначыў:

— «Полымя пад попелам» — першая прэм'ера 2022-га, Года гістарычнай памяці. Мы прысвячаем яго і надыходзячаму 105-годдзю беларускай арміі. Гэтая гістарычная драма — пераклічка пакаленняў, знак павагі да тых, хто нам гэты свет падарыў і хто пасля вайны адраджаў гэтую зямлю. Важна памятаць сваю гісторыю і не забываць аб мінулым.

Арына КАРПОВІЧ.

РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «ДВИГАЙТЕСЬ В РИТМЕ VOLVO»

**Сведения о рекламной игре:**

Наименование рекламной игры: «Двигайтесь в ритме Volvo».

**Территория проведения:**

- Автоцентр и станция технического обслуживания Volvo Car Минск (Минский район, трасса Р-1, 9-й км, 2А (пересечение МКАД и трассы «Минск-Брест»));

- Станция технического обслуживания Volvo Элитавто XXI век, (г. Минск, проспект Независимости, 169 (Бизнес-центр XXI век));

- Офисы продаж ООО «Актив-Рент» (г. Минск, ул. Притыцкого, д. 156, БЦ Green City, 12-й этаж; г. Брест, пр-т Республики 1/2, БЦ Status);

- Спортивный клуб Yestoday (г. Минск, ул. Ефросиньи Полоцкой, 4);

- Точка аренды автомобилей Sixt: Бизнес-центр XXI век, г. Минск, пр-т Независимости, 169, офис 811.

Период проведения: с 13 декабря 2021 г. по 18 февраля 2022 г.

В рекламной игре приняли участие 459 участников.

Призовой фонд рекламной игры разыгран полностью.

Победителем приза «Сертификат на услугу – Подписка на новый автомобиль Volvo на 1 (один) год и денежные средства в размере 4 609,77 белорусских рубля» стал Борис Артур Георгиевич.

Победителем приза «Лось плюшевый 2310057-200-000 VOLVO Кат№30673639» стал Ляшевич Михаил Николаевич.

Победителем приза «Ящик-органайзер складной с логотипом VOLVO ТрендБай Кат№1063» стал Матвеення Юрий Владимирович.

Победителем приза «Модель Volvo S90 Black 1:43 Кат№30673549» стал Высоцкий Павел Михайлович.

Победителем приза «Модель Volvo S90 Mussel Blue 1:43 Кат№30673535» стал Казан Валентин Михайлович.

Победителем приза «Модель Volvo XC60 II White 1:43 Кат№30673950» стала Дермелева Алина Викторовна.

Победителем приза «Беспроводные наушники Apple AirPods 2 / MV7N2 (в зарядном футляре) и денежные средства в размере 33,50 белорусских рубля» стала Чепик Виктория Валерьевна.

Победителями 2 (двух) призов «Клубная карта с безлимитным посещением сроком на один месяц «Taste drive card» и денежные средства в размере 14,94 белорусских рублей» стали Жамойдик Екатерина Игоревна и Овчинников Олег Анатольевич.

Победителями 2 (двух) призов «Клубная карта с безлимитным посещением сроком на 6 месяцев «Grey card 6» и денежные средства в размере 194,25 белорусских рубля» стали Высоцкий Павел Михайлович и Овчинников Олег Анатольевич.

Победителем приза «Клубная карта с безлимитным посещением сроком на 12 месяцев «Grey card» и денежные средства в размере 366,09 белорусских рублей» стал Пильщиков Денис Витальевич.

Победителем приза «Сертификат на аренду автомобиля Sixt на сумму 500 белорусских рублей (аренда автомобиля Weekend), сроком действия 2 месяца и денежные средства в размере 52,30 белорусских рубля» стал Макоед Владислав Николаевич.

Организатором рекламной игры является ООО «ТДИ ПРОМО-ИВЕНТ», 220034, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Краснозвёздная, 18Б, 2-й этаж, пом. 5, УНП 190771520.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 4119 от 02.12.2021, выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры +375447331166 с 8.00 до 20.00 по будним дням и с 11.00 до 15.00 по выходным дням, сайты **volvocarminsk.by, alizing.by и yestoday.by.**

Правила проведения рекламной игры опубликованы в газете «Звязда» № 237 от 08.12.2021.

---

**ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ЗАО «Завод пластиковой упаковки» (продавец) извещает о проведении 24 февраля 2022 года повторного открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2**

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена продажи с НДС, бел. руб. | Задаток (10 %) с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| | **Местонахождение имущества: Минская область, г. Борисов, ул. Ибаррури, 42** | | |
| 1 | Биогазовая электростанция (электрогенератор) Weukesha H24 GLD-200, 2007 года выпуска, серийный номер C17231/1; вырубной штамп производство Германия; маркировочная машина; линия по производству стаканчиков KL2SH KIEFEL, заводской № 3432/54; машина для 6-цветной печати OMSO PC/55 AC, 1996 года изготовления, серийный номер APX0103 96; машина печати на полистир. крышках VAN DAM DLC, серийный номер S102675; устройство: рукав этикеточный; формопласт FORMO plast 235/80,1981 год изготовления, серийный номер 5367; экструдер ROTEX-40D производства «Kiefel», тип V12, серийный номер 0126; термоформующая машина Speedy-BC 7235, год изготовления 1996, серийный номер R1 236.96 | 890 265,60 | 89 026,56 |
| 2 | Вакуумоформировочная машина для изготовления крышек ILLIG RDM 50/3, 1988 года изготовления, серийный номер 140; жидкотопливный стационарный нагреватель WA33 MASTER; двухшпиндельная бабинорезательная машина STM 63-2-S, заводской номер 1106; термоформовочная машина TERMORUNNER KTR-3 тип Endlosstopelgerat KTR-3, год изготовления 09.2008, серийный номер 0820884-1; комплектная трансформаторная машина SWING со станцией предварительного нагрева 2heat и наматывающим устройством для отходов, год изготовления 2014, серийный номер 5646; экструзионная линия Battenfeld, год изготовления 09.2013, серийный номер 3801374; дробилка типа 1000; двухшпиндельная бобинорезательная машина STM 63/2-S со встроенным разматывающим устройством, год изготовления 2013, сер. № 03/13-10951-002; вымывной процессор Concept 305DW; флексографическая машина Stimount; станок для монтажа печатной формы Stiman; Finnpack FLEXO 4, серийный номер 92617; Finnpack; печатная машина Saturno-1200, год изготовления 2007, сер. № 608/3068 | 2 164 795,20 | 216 479,52 |

**Продавец: ЗАО «Завод пластиковой упаковки»**, Гомельская область, г. Речица, ул. Сыдько, д. 115, пом. 11. Контактный телефон +375296555051.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB 30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, ул. Советская, 71, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 22.02.2022 г. в 17.00.**

**С предметом аукциона можно ознакомиться каждую пятницу по предварительному согласованию с ликвидатором.**

**Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом (ИП) РБ – копии свидетельства о государственной регистрации юр. лица (ИП), устава юр. лица; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица РБ – доверенность; представителем физ. лица (ИП) РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, физ. лица, ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет 31, 32, 33 стр. паспорта, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти)** календарных дней с момента подписания протокола; если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** рабочих дней после подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by**

---

***ООО «Центр Белинвентаризация»***
***г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1***

- ✓ **Раздел и установление порядка пользования земельным участком**
- ✓ **Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения**
- ✓ **Пересчет долей в связи с изменением капитального строения**

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ИМУЩЕСТВА ОАО НТК «АЛЕСЯ», тел. 8 (0232) 29 51 13

| № лота | Наименование объекта | Начальная стоимость лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Часть капитального строения (здание магазина № 10 «Черниговский» и кафетерий «Лавашня») с инв. № 350/С-166466 площадью 56,0 кв. м, расположенная по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 301. Срок договора аренды 3 (три) года, арендная плата в месяц 1135,68 руб. с учетом НДС 20 %. Цель использования: для оказания услуг (кроме общественного питания), для организации торговли непродовольственными товарами | 283,92 руб. | 28,39 руб. |

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **По 14 марта 2022 г.** в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **15 марта 2022 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY71BPSB30121783390109330000 в РД № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266.<br>Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация».<br>Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещения в газете «Звязда» от 12.02.2022 г. |
| **Условия продажи права аренды** | Шаг аукционных торгов – 10 %. Заключить договор аренды в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона |

Для участия в аукционе необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с ООО «Центр Белинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
8. Участник аукциона, выигравший торги, либо лицо, признанное покупателем, оплачивает стоимость затрат на организацию и проведение аукционных торгов – Организатору аукционных торгов.
9. Аукцион проводиться в соответствии с действующим законодательством и Положением ООО «Центр Белинвентаризация».

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 50 56 62, (029) 341 15 45**

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора, директора ООО «Правовая Стратегия»**
(220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 67, офис 1404, п/я 34)
**проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества КУП «Червенский деревообрабатывающий комбинат»**
(223232, Минская область, г. Червень, ул. Минская, 71)
**в составе:**

**недвижимое имущество:**

- **лесопильный цех, инв. № 615/С-15978, общей площадью 463,0 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 625850100001003967 площадью 0,6739 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, г. Червень, ул. Минская, 71;**
- **компессорная, инв. № 615/С-16032, общей площадью 62,2 кв. м;**
- **трансформаторная подстанция № 2, инв. № 615/С-16033, общей площадью 13,6 кв. м;**
- **склад, инв. № 615/С-15977, общей площадью 403,8 кв. м;**
- **котельная** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 615/С-15983, общей площадью 504,5 кв. м;**
- **ремонтный цех** *(составные части и принадлежности: подвал, мастерская, сарай)*, **инв. № 615/С-16275, общей площадью 549,1 кв. м;**
- **здание цеха** *(составные части и принадлежности: 10 (десять) пристроек)*, **инв. № 615/С-16276, общей площадью 3531,5 кв. м;**
- **трансформаторная подстанция № 1, инв. № 615/С-15979, общей площадью 42,3 кв. м.**

Часть объектов обременена договорами аренды, сведения о которых можно получить у организатора торгов.

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 625850100001003966 площадью 1,9011 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, г. Червень, ул. Минская, 71.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона газораспределительной системы, пл. 0,0096 га.*

**Оборудование:**

- **трансформатор силовой ТМГ-400/10/0,4, инв. № 111, заводской № 1149360;**
- **ленточнопильный станок МВ-2000, инв. № 99-8;**
- **приспособление для заточки ленточных пил ПЗП-10.00.000;**
- **приспособление для разводки ленточных пил ПРП-11.00.000;**
- **рама лесопильная Р63-4Б, инв. № 120.**

**Оборудование расположено по адресу: Минская область, г. Червень, ул. Минская, 71.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **757 905,73** бел. руб.
(задаток 10 % от начальной цены – **75 790,00** бел. руб.).

***Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».***

Шаг аукциона – 5 процентов.

Порядок проведения аукциона регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

Лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах, документ о внесении суммы задатка на р/с, указанный в извещении, с отметкой банка, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: юр. лицом РБ – копии устава со штампом о проведении гос. регистрации, свидетельства о гос. регистрации и их подлинники для заверения копий, доверенность представителю юр. лица или документ, подтверждающий полномочия руководителя юр. лица; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юр. лица или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; индивидуальным предпринимателем РБ – копия свидетельства о гос. регистрации и подлинник для заверения копии; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного физ. лица, индивидуального предпринимателя – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в торгах физ. лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физ. лица, индивидуального предпринимателя, юр. лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов соглашение.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника предмет торгов продается ему по начальной цене, увеличенной на 5 %.

В день проведения торгов победитель торгов (единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) подписывает протокол о результатах торгов.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель).

Аукцион состоится **15.03.2022 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14.03.2022** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, телефон для осмотра 029 335 74 49.**

УНП 60003899

---

## Отчет Местного благотворительного Фонда «Возрождение историко-архитектурных памятников г. Мстиславля» об использовании своего имущества за 2021 год

Местный благотворительный Фонд «Возрождение историко-архитектурных памятников г. Мстиславля» информирует о продолжении своей деятельности согласно Уставу по адресу: 213453, Могилевская область, г. Мстиславль, ул. Чкалова, д. 26.

1. Учредители фонда: Галактионова Светлана Юрьевна, Кириенко Людмила Сергеевна, Кнороз Наталья Анатольевна, Малиновская Татьяна Николаевна, Пиванков Владимир Николаевич, Валюженич Игорь Александрович, Поклад Татьяна Сергеевна, Пискижова Валентина Григорьевна, Федоненков Николай Викторович, Цырикова Наталья Михайловна.

2. Информация о стоимости имущества фонда:

- имущество, переданное учредителями фонда, – 1800 рублей 00 копеек;

- доходы, полученные от добровольных взносов и пожертвований граждан и организаций, – нет;

- доходы от предпринимательской деятельности, осуществляемой в порядке, предусмотренном действующим законодательством, – нет.

3. Фонд не является учредителем унитарных предприятий, хозяйственных обществ и не участвует в создании других юридических лиц.

УНП 790613221

Лёс чалавечы

# СТАРЭЙШЫ ЗЯЦЬ

**— Хочаш паляндвічкі? — на мяне глядзелі два цікаўныя вокі, нібыта аналізавалі, ці можна мець са мной справу, бо сядзець пад дзвярыма нам, магчыма, давядзецца доўга. Справу мець я, можа, і не супраць, але ж у такой сітуацыі, пры чарзе... Якая ежа? «А што, вайна вайной — абед па раскладзе...» — пах бутэрброда ўзмацніўся водарам свежага агурка, які быў парэзаны на лустачкі, складзеныя ў кантэйнерчык. «Зяць паклапаціўся, — перахапіла яна мой позірк. — Ён у мяне залаты». Пра тое, што сапраўды залаты, я падумала, калі ён прыехаў забраць цешчу. І ўсе наступныя мае стасункі з Эмай Антонаўнай былі напоўнены нябачнай прысутнасцю яе зяця.**

Нельга сказаць, каб ён быў надта відны ці моцны — наадварот, невысокі ды хударлявы і вельмі сціплы мужчына, такія бываюць нябачныя ў натоўпе, бо раствараюцца ў ім з-за сваёй здольнасці ніяк не вылучацца сярод іншых.

Аляксандр нават знешне не адпавядае фармулёўцы «моцнае плячо». Ён не любіць фармулёўкі і лічыць, што галоўнае — быць чалавекам. «Не модна, казала я яму, — распавядала цётка Эма, па ўзросце як мая мама. — Шмат тых, хто захоча скарыстацца тваёй дабрынёй, а гэта, як правіла, пагражае выдаткамі. А ён сказаў: гэта як паглядзець».

Эма Антонаўна пра ўсё разважае на ўзроўні «выдаткі-прыбыткі», акурат як бізнес-лэдзі. Рана аўдавела, на руках засталіся дзве дачкі-школьніцы, дык і прыйшлося пачаць сваю справу. Ну, як справу... Вазіць валізкі шмацця ды гандляваць на базары — не надта лёгкая для жанчыны ды прыбытковая праца, але дзяўчат падняць дапамагла. Цягнула на сабе ўсё, слабай магла быць толькі ў сне, калі бачыла мужа і размаўляла з ім. Ён усё абяцаў, што хутка прыйдзе дапамога...

І вось старэйшая дачка прыехала дадому з жаніхом. Не такога памагатага чакала маці. Студэнт з мізэрнай стыпендыяй, ды і «хлюпік» на выгляд — сталічны жыхар, што на яго разлічваць у іх глыбокаправінцыйным побыце? А той быў моцна ўражаны, якую лямку цягне будучая цешча, абы дзяўчаты вучыліся ды прыстойна апраналіся. Сама маці ў адных джынсах і кофце, валасы закручаныя ў гулечку, каб эканоміць на цырульні, хата завалена таварам. Але цешча і на вяселле ўжо назбірала, каб усё было як у людзей.

«Не, мы пойдзем іншым шляхам, — адрэзаў будучы зяць. — На матулі ездзіць нельга. Ніякіх грошай ад яе не браць — самой цяжка, цяпер яны павінны ёй дапамагаць: «Яна ж адна...» Таму ніякага вяселля не будзе. Эма Антонаўна спрабавала было паскандаліць: яна ж старалася, каб у дачок было ўсё па-людску. «Цяпер гэта не ваш клопат», — адрэзаў зяць.

Маладыя распісаліся без вяселля. Знялі кватэру, але адмовіліся ад бацькоўскай дапамогі цалкам — Саша ў вялікай сям'і быў старэйшы з трох братоў. Студэнт адразу пайшоў падпрацоўваць сантэхнікам. Цешча кпіла з дачкі: вось табе і будучы інжынер...

Але за пару месяцаў Сашу пачалі пазнаваць і паважаць у раёне, дзе яны жылі і які ён абслугоўваў: старыя дамы, старыя людзі, а ён уважлівы, сумленны і добразычлівы, не толькі выпраўляў сітуацыю, але і падказваў матэрыялы і прылады больш надзейныя і недарагія. Некаторыя звярталіся, каб параіцца перад рамонтам. Асабліва чулыя бабулькі ў падзяку частавалі — то піражкоў, то яблычак у пакеты накладвалі. Адна з кліентак потым моцна дапамагла. Маладая мама апынулася ў бальніцы, а Саша застаўся з немаўлём адзін — гатаваў сумесі, карміў, мыў і калыхаў, пакуль не патэлефанавала Вольга Данілаўна, у якой сарвала кран. Угаварыла: пайшоў з каляскай — тата працаваў, а яна глядзела малога. А пасля Данілаўна прапанавала сябе ў нянькі, каб Саша мог па справах выйсці. Калі Эма Антонаўна вызвалілася і прыехала дапамагаць зяцю з дзіцем, зайшла ў кватэру — аслупянела: жонкі няма, дык муж у хату прывёў... бабку. Нават тут не як у людзей...

Данілаўна жыла без дзяцей і ўнукаў, радавалася, калі была карыснай камусьці. Прыйшоў Саша, уручыў ёй пакет з прадуктамі ў падзяку, вінавата паглядзеў на цешчу: «Яна ж адна». — «А кватэра ў яе вялікая?» Эма Антонаўна за гады змагання з жыццём стала меркантыльным чалавекам. Яна як рака з крутымі берагамі — не пакідала варыянтаў адхіліцца ад зададзенага рэчышча, а магутнай плынню гатовая была зносіць любыя перашкоды на шляху да мэты: жыць у дастатку. І калі замаячыла перспектыва пашырыць рэчышча, то... Саша катэгарычна запярэчыў: ніякіх планаў! У Данілаўны ў жыцці былі адны страты. Ды і кватэра ў яе не прыватызаваная. Адзінокая безабаронная жанчына, няхай хоць дробная дапамога ёй будзе, не абяднеюць.

У цешчы здалі нервы — ну, усё насуперак! А зяць ціха і настойліва пераконваў: мэты ў іх супадаюць, разыходзяцца толькі падыходы ў рэалізацыі. У яго ёсць планы, бо сантэхніка — вельмі перспектыўная справа. І так прыгожа, нават рамантычна распавядаў пра краны, шлангі, кераміку (яна бывае нават чорная, уявіце, гэта эфектна, але і вельмі смела). І бачыла, што стараецца, але ніяк не магла паверыць у яго бізнес і не падтрымала, хоць і магла выдзеліць суму на пачатак. Ну, прыдумае ж такое: не каб далей ад бруду, а ён у бруд. «Хтосьці ж гэтым павінен займацца», — пярэчыў Саша.

Сям'я пакрысе абрастала маёмасцю ды дзецьмі. Аддалі замуж другую дачку, згулялі пышнае вяселле. Светка ў адрозненне ад Валі вельмі хацела пакрасавацца ў прыгожай сукенцы побач са сваім закаханым рыцарам. Якое шчасце дачцэ выпала: высокі, статны, прыгожы. Віднага зяця дачакалася Эма Антонаўна. Свой, мясцовы хлопец, усё разумее пра жыццё, як і яна. І гаварун — на любы выпадак жыцця анекдот знойдзецца. А спрытны: усё ў яго неяк проста атрымлівалася. Нарэшце ў хаце з'явіўся памочнік, нарадавацца не магла. Па гаспадарцы завіхаўся, хлеў падправіў, цяпліцу паставіў, у хаце рамонт пачаў — прыклаў рукі — не тое што Саша ўвесь час паўтараў: «Пераязджайце да нас у Мінск...» «А чаму б і не?» — аднойчы завёў размову новы зяць. Падышоў час займацца ўнукамі, а яны тут ужо самі справяцца. Вось жа ён і з працы звольніцца, каб займацца гаспадаркай. Хату можна адбудаваць шыкоўную, двор упарадкаваць, як на карцінках. Грошы ж назапашаны ад бізнесу, чаго іх трымаць? Трэба жыць зараз.

Усё правільна, пагаджалася Эма Антонаўна, толькі ніяк не магла ўцяміць, чаму яна павінна ўсё пакінуць ім? Не даспадобы ёй гарадское жыццё, гэтыя шматпавярховікі з кватэрамі-клеткамі, няхай і ўладкаванымі. Раз-пораз узнікалі гэтыя размовы, усё больш было непаразуменняў, калі малодшы зяць чарговы раз прасіў у яе грошы на «тое адраманатаваць» ці «гэта выправіць». Атрымалася, што «багатая» цешча Эма Антонаўна пасадзіла сабе на шыю маладую сям'ю.

У нейкі момант ім стала цесна пад адным дахам. А праз некаторы час зяць зазбіраўся на заробкі ў Расію, бо ўсё, што прапанавалася побач, было яго не варта, грошы не тыя, а цешча не дае жыць спакойна.

Дадому яго не надта цягнула. Нават калі Святлана патэлефанавала, каб паведаміць, што яны стануць бацькамі. Як жа гэта, аказваецца, несвоечасова... Тэлефонныя размовы не былі надта плённыя. Перажыванні для цяжарных заўсёды небяспечныя, а ў няпэўнай сітуацыі яны памнажаюцца шматкроць.

«Вася, міленькі, што ж гэта робіцца?» — плакала ноччу маці і клікала мужа-нябожчыка. А раніцой прыйшла дапамога: Саша па справах збіраўся ў Маскву, удакладняў Вадзімаў адрас. Некалькі дзён сядзелі як на іголках, пакуль не вярнуўся. Стомлены, але спакойны, сеў і кажа так упэўнена: «Нічога, выгадуем». Бо яна ж засталася адна...

Дзяўчынка нарадзілася кволенькая. А Света пасля разводу пачала прыкладвацца да бутэлькі. Аднойчы заснула ў парку побач з каляскай, людзі сталі заўважаць, што ўсё можа скончыцца кепска. Падчас чарговага «залёту» ў міліцыю завялі размову пра апякунства. Вырашаць сітуацыю прыехала старэйшая дачка з мужам. Разграбалі ўвесь бруд вакол сям'і, разбіраліся са сваякамі другога зяця. Афармілі дзяўчынку. Саша загрузіў увесь іх скарб у прычэп — і ўсе разам рушылі ў новае жыццё.

Ехалі доўга. А калі абмінулі Мінск, Эма Антонаўна захвалявалася. «Выж не хацелі ў горад?» — папярэдзіў яе пытанні зяць. — «Дык будзеце ў вёсцы, але непадалёк». Хата, якую ён набыў, месцілася на ўскрайку вёскі. Ну, як хата? Дыхтоўны прасторны дом з прыбудовай. Проста мара: побач лясочак, чысцюткае паветра. Унутры свежы рамонт, новая тэхніка і гонар яго фірмы — шыкоўная прыбіральня, якую цяжка было ўявіць у прыватным доме. Месца — на некалькі сем'яў. Вялікі двор з дзіцячай пляцоўкай, а за ёю на лужку вальяжна расхаджвала белая козачка. «Будзем Ганначку паіць малачком», — паведамілі старэйшыя ўнукі, гатовыя да пашырэння сям'і. Усё прадумаў!

...Прачынацца ранкам больш не страшна. Унучка сваімі маленькімі пальчыкамі намалявала на бабуліным акенцы сонейка з усмешкай — каб першыя ж крокі дарылі добры настрой на ўвесь дзень. Цяпер у яе няма пахмурных дзён. Зніклі трывогі, з'явіўся спакой, што яна ўжо ўсё зрабіла. Не трэба баяцца чагосьці не паспець — нават калі так, то ёсць той, хто паспее і даробіць. Вось дзе радасць! Так бывае, што зло ў сваё жыццё мы самі прыцягваем несправядлівым стаўленнем да іншых. Павярхоўна ацэньваем тых, хто побач. Крыўдзім недаверам, адштурхоўваем гордасцю, пераацэньваючы сваю моц. А лёс падкідвае сітуацыі, каб навучыць лепш разумець людзей, пераглядзець адносіны да іх. Хто ведае, можа, усе нашы непрыемныя сітуацыі і здараюцца дзеля гэтай навукі? Жорстка, але інакш не дойдзе ці банальна не хопіць часу. Эма Антонаўна папраўляе капялюшык на голай пасля курсу «хіміі» галаве, складвае тэлефон у сумку — яна не адна на сваёй вайне, зяць пад'ехаў. І крочыць яму насустрач.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# ЧЭРВЕНЬ 1942 ГОДА... ПЕРШЫ «ЗВЯЗДОЎСКІ» НУМАР


ЗВЯЗДА
БЛІЗКІ ЧАС АСЛАБАНЕННЯ

**Калекцыянер, кніжнік, дасведчаны ў беларускай гісторыі руплівец, Зміцер ЦЕХАНОВІЧ прынёс у рэдакцыю «Звязды» два рарытэтныя экзэмпляры перыядычных выданняў часін Вялікай Айчыннай вайны. Адзін асобнік — фотакопія першага нумара падпольнай «Звязды», які выйшаў у Мінску ў чэрвені 1942 года.**

Пад фотакопіяй маецца на ўвазе растыражаваны ў Маскве экзэмпляр. Відавочна, калі арыгінал газетнага нумара (так і пазначана ў шапцы «Звязды» — як органа Мінскага Гаркома КП (б) Б — «№ 1 чэрвень 1942 г.») выйшаў у акупаваным фашыстамі Мінску і трапіў у Маскву, у Цэнтральным штабе партызанскага руху было прынята рашэнне раздрукаваць газету масавым накладам. Вось такі «маскоўскі» асобнік, копія мінскага экзэмпляра, і «вярнуўся» да нас, у «Звязду». Доўгі час (ці не семдзесят і болей гадоў?!) экзэмпляр захоўваўся ў хатнім архіве аднаго з былых партыйных работнікаў, паплечнікаў П. Панамарэнкі ў час вайны.

Чытаем зварот ад рэдкалегіі: «*Таварышы! З сённяшняга дня Мінскі Гарком КП(б)Б аднаўляе выданне свайго органа — газеты «ЗВЯЗДА». Пішыце ў газэту аб жыцці партызанскіх атрадаў, аб баявой іх дзейнасці, аб паасобных партызанах, праявіўшых сябе ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі акупантамі*».

«Шапка» першай старонкі, першай газетнай паласы фармата А4 (а ўсяго старонак — дзве): «1942 год павінен быць годам поўнага разгрома ворага! Смерць нямецкім акупантам!» Рэдакцыйны артыкул — «Шырэй партызанскую барацьбу!» У цэнтры — «Блізкі час аслаблення», зварот сакратара ЦК КП (б) Б. Ніжэй — інфармацыя «Устанаўленне новага баявога ордэна — ордэна Айчыннай вайны». Справа — «Весткі з франтоў Айчыннай вайны».

На другой старонцы — слова Якуба Коласа «*Зара вызвалення займаецца над Беларуссю*» «*Беларусь, родная Савецкая зямля! Ты зноў чуеш громы грознай навальніцы. Зноў садрыгаюцца лясы і прасторы тваіх палёў ад гуду гармат, ад грукату танкаў і рэву самалётаў. Вялікія бітвы пачаліся і канчаюцца на табе, беларуская зямля. Але не з цёмнага фашысцкага захаду, а з ясных усходніх далячынь грыміць сёння пераможнае водгулле вайны і плыве, усё далей і далей на захад, як голас прадвесня, як весць свайго вызвалення...*»

Яшчэ ў нумары пад рубрыкай «Партызанскія навіны» артыкул «2000 супроць... аднаго». Пра тое, як карацельны атрад фашыстаў колькасцю каля 2000 немцаў рушыў у паход на партызан. «Але храбрасць нямецкіх вояк выявілася перад лесам. Яны нават свой нос пабаяліся туды пасунуць. Пастралялі, пагрукалі па хмызьняку і... вярнуліся назад. <...> Каб не ўдарыць тварам у гразь, яны арыштавалі ні ў чым непавіннага лясніка С. Ня дзіва, што пасля гэтых «аперацыяў» у ваенных паведамленнях фашысцкіх брахуноў вымушаны з'явіцца поўныя пахвальбы словы аб знішчэньні «дужэйшых партызанскіх груп і аддзелаў»...

У кнізе М. Дастанкі «Газета «Звязда» ў гады Вялікай Айчыннай вайны» (Мінск, 1970) чытаем: «У нядзелю, 20 верасня, выйшаў чацвёрты нумар падпольнай «Звязды». <...> Гэта быў апошні нумар падпольнай «Звязды», які ўдалося выпусціць. Пяты нумар яе, падрыхтаваны да друку, не ўбачыў свету. У ноч на 26 верасня 1942 г. гестапаўцы арыштавалі 21 падпольшчыка. У фашысцкія засценкі былі кінуты ўсе члены Мінскага падпольнага камітэта і сакратары гарадскіх райкомаў партыі.

Мужна і стойка пераносілі патрыёты нечалавечыя катаванні. Многія ўдзельнікі падполля загінулі ў страшэнных пакутах у душагубках, на шыбеніцах або ад варожай кулі ля турэмнай сцяны».

Другі падарунак-напамін Зміцера Цехановіча пра цяжкія гады — арыгінальны нумар рудзенскай падпольнай, партызанскай газеты «Большэвіцкі сцяг» (экзэмпляр захоўваўся ў сям'і нашчадкаў пісьменніка і журналіста-«звяздоўца» Макара Паслядовіча) за ліпень 1943 г. Адну газетную заметку прывяду цалкам: «*Гэтымі днямі нямецка-фашысцкія бандыты, адчуваючы сваю пэўную гібель, утварылі некалькі актаў новых зверстваў над мірнымі жыхарамі вёсак.*

*Два разы фашысцкія самалёты бамбілі раней спаленую і разбамбёную вёску Гарэлец. Апошні раз фашысты бамбілі землянкі жыхароў вёскі, у якіх яны жылі замест спаленых хат. Ёсць тры жыхары раненыя, сярод іх 2 жанчыны.*

*Некалькі дзён падрад па 5-6 бамбардзіроўшчыкаў бамбілі вёскі Азярычын, Пяскі, Баркі і рад другіх вёсак Рудзенскага раёна. Ёсць забітыя дзеці, старыкі, жанчыны. Спалена шмат дамоў.*

*У вёсцы Караваева фашысцкія бандыты спалілі каля 30 хат.*

*Так гітлераўскія галаварэзы будуюць свой «новы парадак» у Беларусі*».

Народ Беларусі і вытрываў у жудасным полымі выпрабаванняў, і перамог. У гэтым змаганні не апошнюю ролю адыгрываў і партызанскі, падпольны антыфашысцкі перыядычны друк.

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

# СНЕЖНЫ СНАЙПЕР ТРАПІЎ У ЦЭЛЬ




*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Але неяк старэйшая дачка Марыя захацела навучыцца катацца на лыжах. Ёй спадабалася, і яна стала катацца. Этап за этапам прайшла адбор на «Снежны снайпер», выйграла рэспубліканскі этап. Пачала займацца і кожны год выступала на гэтым турніры. За старэйшай сястрой пацягнуўся і Акім. Цяпер ён прадстаўляе каманду Мінскай вобласці на рэспубліканскім этапе «Снежнага снайпера». Нядаўна арганізатары ўвялі групу для ўдзельнікаў 2011/2012 гадоў нараджэння. І малодшы дзевяцігадовы Клім цяпер таксама ў Раўбічах рыхтуецца да спаборніцтваў. Так ужо восем гадоў мы ўдзельнічаем у турніры», — расказвае Аксана Гнедчык.

Услед за Марыяй любоўю да лыж прасякнуліся не толькі малодшыя браты, але і бацькі — купілі сабе лыжы, падрыхтавалі інвентар і праверылі лыжню. Таму і да «Снежнага снайпера» дзеці рыхтуюцца з бацькамі. Аксана Мікалаеўна сцвярджае, што асабісты прыклад і падтрымка бацькоў для дзяцей вельмі важныя. І жартуе, што ў такіх умовах у малодшага Кліма выбару амаль не было. Яго з нараджэння паставілі на лыжы і навучылі катацца. Кліму заставалася толькі замацоўваць навыкі і атрымліваць усе перавагі катання на лыжах. А іх, па словах Аксаны Мікалаеўны, мноства: «Не ведаю, ці зробяць хлопчыкі лыжы сваім асноўным заняткам, але тое, што яны набудуць ад іх здароўе — адназначна. У лыж мноства пераваг. Лыжы і плаванне — гэта аснова ўсяго. І менавіта з гэтых дысцыплін варта пачынаць фізічную падрыхтоўку дзяцей. Потым ужо падключаць астатняе. Усе лыжнікі, біятланісты з малых гадоў ставяць сваіх дзяцей на лыжы. Гэта, перш за ўсё, здароўе і добры навык на ўсё жыццё. І агульнафізічная падрыхтоўка ў лыжнікаў выдатная. Я менавіта з гэтага пачынала б». Таксама спартыўная мама раіць падключаць фехтаванне: яно развівае інтэлектуальна. Прыкладаў мноства. Чатырохразовая алімпійская чэмпіёнка Алена Бялова — прафесар БДУФК, алімпійскі чэмпіён Томас Бах сёння ўзначальвае Міжнародны алімпійскі камітэт, а чатырохразовы пераможца Гульняў Станіслаў Пазнякоў кіруе Алімпійскім камітэтам Расіі.

## ПА СЛЯДАХ ЧЭМПІЁНАЎ

Такія спаборніцтвы, як «Снежны снайпер», — у цэлым добрая магчымасць развіць, выхаваць асобу, замацаваць у маленькім чалавеку мэтанакіраванасць, навыкі камунікацыі, цярпенне і іншыя якасці, неабходныя не толькі ў спорце, але і ў звычайным жыцці. Падрыхтоўка да старту развівае дзяцей не толькі фізічна, але і псіхалагічна. «Дзеці, дзякуючы сваёй эмацыянальнасці і здольнасці, хутка аднаўляюцца, могуць спаборнічаць хоць кожны дзень. І менавіта на такіх дзіцячых спаборніцтвах фарміруецца псіхалогія пераможцы, умацоўваецца ўпэўненасць у сабе і сваіх сілах. Я вучу дзяцей заўсёды перамагаць, няважна, якога ўзроўню гэта спаборніцтвы. «Снежны снайпер» ужо стаў настолькі папулярным, што сам удзел у гэтым турніры для дзяцей — вялікая матывацыя рыхтавацца, трэніравацца», — тлумачыць Аксана Гнедчык.

Сапраўды, «Снежны снайпер» для юных біятланістаў — галоўны старт, які вучыць дасягаць мэт. Каб дайсці да галоўнага заключнга этапу ў Раўбічах, трэба прайсці адбор у сваёй школе, раёне, вобласці. Гэта займае некалькі месяцаў і патрабуе шмат сіл. У Раўбічы прыязджаюць самыя моцныя і самыя мэтанакіраваныя. Перад стартам яны праводзяць вучэбна-трэніровачны збор, прывыкаюць да трас, да стрэльбішча — усё, як патрабуецца на сур'ёзных турнірах. А сёлета правядзенне фіналу «Снежнага снайпера» супала з біятлоннымі спаборніцтвамі на Алімпійскіх гульнях. Можна толькі ўявіць, з якім настроем юныя біятланісты выходзяць на старт галоўнага для іх турніру. «Якую можна прыдумаць лепшую матывацыю для дзяцей, чым трэніравацца там, дзе трэніраваўся Антон Смольскі, які заваяваў «серабро» на Алімпійскіх гульнях? Што для іх можа быць лепей, чым трэніравацца там, дзе займаўся іх кумір, катацца па тых жа трасах? Роўна чатыры гады таму мая дачка выйграла асабістую гонку і эстафету на «Снежным снайперы». І вось дзеці стаяць, чакаюць узнагароджання, а да іх на лыжах пад'язджаюць Прэзідэнт і алімпійскія чэмпіёнкі Пхёнчхана Дар'я Домрачава, Дзінара Алімбекава і Ірына Крыўко. Яны ж і праводзілі ўзнагароджанне. Для дзяцей гэта быў невергодны сюрпрыз! Іх эмоцыі, калі яны ўбачылі Прэзідэнта і чэмпіёнак, нельга апісаць словамі. Для іх гэта свайго роду Алімпійскія гульні, яны там жывуць біятлонам, асабліва пасля медаля Антона Смольскага», — расказвае Аксана Гнедчык.




## АЛІМПІЙСКІЯ ДЗЕЦІ

Марыя, якая ў сям'і стала закаканадаўцай любові да лыж, цяпер займаецца сучасным пяцібор'ем. Па традыцыі, за сястрой цягнецца і Акім. «Дзеці ўмелі плаваць і бегаць. І я ўбачыла інфармацыю аб тым, што федэрацыя сучаснага пяцібор'я арганізавала для дзяцей спаборніцтвы па біятле (бег і плаванне) і трыятле (бег, стральба, плаванне). Мы вырашылі паспрабаваць. Марыя і Акім у сваіх узроставых катэгорыях выйгралі тыя спаборніцтвы. І федэрацыя сучаснага пяцібор'я прапанавала ім паўдзельнічаць у чэмпіянаце Еўропы ў Партугаліі. Яны яшчэ былі маленькія: Машы — 12 гадоў, Акіму — 8. З гэтага ўсё і пачалося».

Цяпер Марыя Гнедчык — майстар спорту па сучасным пяцібор'і, рыхтуецца да першага ў сваім жыцці этапу Кубка свету сярод дарослых. Спартсменка ўваходзіла ў топ-10 чэмпіянатаў Еўропы і свету ў сваёй узроставай катэгорыі. Сёлета Марыя стала стыпендыятам Прэзідэнцкага спартыўнага клуба. Цікава, што ўсе дзеці ў сям'і Гнедчык нарадзіліся ў алімпійскія гады. Марыя — у 2004, Акім — у 2008, Клім — у 2012, акурат падчас алімпійскай праграмы па лёгкай атлетыцы. З такім супадзеннем іншага занятку, акрамя спорту, у іх сапраўды не было. Яшчэ і гены. Аксана Гнедчык усё жыццё звязала са спортам. Трэнер па лёгкай атлетыцы цяпер вучыць пяцібор цаў правільна бегаць. І заадно прывівае сваім дзецям любоў да спорту і здаровага ладу жыцця.

«Мне з дзяцінства падабалася займацца спортам. Але я не рэалізавала сябе так, як хацела. Тады быў цяжкі час, развалiўся Савецкі Саюз, неяк не да спорту было. Паколькі ў маім жыцці ёсць такая недаказанасць, я хачу дапамагчы сваім дзецям дасягнуць поспеху. Я бачу, што ў іх ёсць схільнасці, і хачу дапамагчы іх развіць. І дапамагчы ў першую чаргу як мама, а не як трэнер. Не хачу, каб мае дзеці трэніраваліся ў мяне. Я дам ім пэўную базу. Мне хочацца, каб яны былі рознабаковымі асобамі. Мне вельмі падабаецца сістэма, калі дзеці займаюцца рознымі відамі спорту, а гадоў у 16 выбіраюць той, які падабаецца больш і да якога ёсць здольнасці. Такая сістэма дае вынік. Таму мае дзеці займаюцца рознымі відамі спорту, а потым выбіраюць адзін. Маша свой канчатковы выбар зрабіла ў 16 гадоў. Хоць і на лыжах каталася, і ў лёгкай атлетыцы былі перспектывы. Але яна выбрала сучаснае пяцібор'е, і яе падтрымліваю», — дзеліцца Аксана Гнедчык.

Задача не трэнера, а мамы — правільна настроіць свайго спартсмена на выступленне. І тут, як адзначае Аксана Мікалаеўна, вельмі тонкая мяжа. З аднаго боку, трэба настроіць дзіця на перамогу, з іншага — расказаць, што здарыцца і паражэнні. У спорце інакш нельга. «Калі дзіця ставіць перад сабой высокія мэты і ў яго нешта не атрымліваецца, мама павінна спачатку пашкадаваць, супакоіць. А толькі потым рабіць разбор палётаў і памылак. Акім удзельнічаў у чэмпіянаце свету, і ў яго не склалася стральба. Ён не адабраўся ў фінал. Былі слёзы, крыўды. У гэты момант для мяне самае складанае — супакоіць сябе і данесці сыну, што ўсе перамогі яшчэ наперадзе. Самае галоўнае — знайсці ў сабе сілы супакоіцца. Мне, з прычыны майго характару, часам гэта складана. З Марыяй прасцей, бо яна ўжо сама ведае, што рабіць, у яе ёсць трэнер. Я стараюся глядзець усе выступленні сваіх дзяцей, па магчымасці ездзіць з імі на турніры. Але ў працэс падрыхтоўкі не лезу. Нават не хачу, каб мае дзеці ў мяне трэніравалася. Рыхтаваць спартсмена павінен трэнер з безумоўным аўтарытэтам, а не мама, з якой можна спрачацца і якая будзе шкадаваць», — дзеліцца яна.

Вопытная спартыўная мама раіць усім абавязкова прывіць дзецям любоў да спорту. Няважна, атрымаецца з іх другая Дар'я Домрачава ці не, — галоўнае, што з дзяцінства будзе ўмацавана здароўе і закладзены правільныя арыенціры: «Дзякуй богу, у маіх дзяцей ніякіх праблем са шкоднымі звычкамі не ўзнікае. Яны ўсё жыццё ў спорце. Каб дасягнуць поспеху ў любой сферы, трэба быць у першую чаргу здаровым. Як ты зможаш прыносіць людзям карысць, калі дрэнна сябе адчуваеш? Спорт найвышэйшых дасягненняў — справа не для ўсіх. Але фізічнай актыўнасцю павінен займацца кожны. І дарослым людзям, бацькам я параіла бы пачаць з сябе. Як можна тлумачыць дзецям пра карысць спорту, седзячы на канапе? А разам з імі выйсці на вуліцу, пагуляць у мяч, пакатацца на лыжах — зусім іншая справа. І гэты прынцып «пачні з сябе» працуе ўсюды».

## АД РАЎБІЧ ДА ПЕКІНА — БІЯТЛОН УСЮДЫ

Фінальны этап спаборніцтваў «Снежны снайпер» праходзяць у Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па зімніх відах спорту «Раўбічы». У праграме турніру — спрынтарскія гонкі, масстарты і змешаныя эстафеты.

Першых «Снежных снайпераў» краіна прадставіла ў 2007 годзе. За гэтыя гады турнір стаў адным з самых папулярных і масавых сярод стартаў юных спартсменаў. У гэтым сезоне 24 173 школьнікі прынялі ўдзел на ўсіх этапах турніру. А найлепшыя 168 адправіліся ў Раўбічы, каб якасна падрыхтавацца да галоўнага ў іх кар'еры старту.

Па выніках Беларуская федэрацыя біятлона адзначыць самых таленавітых спартсменаў, правядзе спецыяльнае тэсціраванне і адбярэ самых здольных для заняткаў біятлонам на больш сур'ёзным узроўні. «Снежны снайпер» стаў першым крокам у вялікі спорт для многіх прафесійных біятланістаў. Зусім нядаўна ў турніры ўдзельнічалі члены юніёрскай нацыянальнай зборнай Іван Тулацін, Дар'я Кудаева, Раман Чапыжаў, Наталля Карніцкая, Аляксей Логінаў, Вікторыя Шашкова. Аліна Пільчук увайшла ў склад беларускай каманды на Алімпійскія гульні ў Пекіне і зараз прадстаўляе краіну на галоўных стартах.

Нягледзячы на юны ўзрост удзельнікаў, на «Снежным снайперы» ўсё сур'ёзна: новая спартыўная форма, прамая трансляцыя спаборніцтваў, біятлонныя дробнакаліберныя вінтоўкі, стадыён сусветнага ўзроўню.

Як паведамляе Прэзідэнцкі спартыўны клуб, з кожным годам інтарэс да біятлона і «Снежнага снайпера» расце, асабліва ў рэгіёнах. Прычына — якаснае правядзенне турніру па прыкладзе сапраўднага біятлона. Раней дзеці асобна стралялі ў ціры і бегалі на лыжах на стадыёне. Аднак Прэзідэнцкі спартыўны клуб закупіў 2250 пнеўматычных вінтовак і 3000 мішэневых установак і перадаў іх ва ўсе рэгіёны краіны. Гэта дазволіла абсталяваць біятлоннае стрэльбішча проста на лыжнай трасе, больш якасна рыхтавацца і паказаць дзецям сапраўдны біятлон.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# НА ХВАЛІ ПУТЧАЎ

## Чаму Афрыку захліснула серыя пераваротаў?

**Саміт Афрыканскага саюза, які адбыўся ў сталіцы Эфіопіі, асудзіў хвалю дзяржаўных пераваротаў у рэгіёне. Аб гэтым заявіў на выніковай прэс-канферэнцыі камісар АС па палітычных пытаннях, міры і бяспецы Банколе Адэоі, паведаміла Le Figaro. Паводле яго слоў, Афрыканскі саюз «не пацерпіць ніякага ваеннага перавароту ў якой бы там ні было форме». Нігерыйскі дыпламат дадаў, што членства ў Афрасаюзе дзяржаў, якія перажылі путчы, рашэннем Савета міру і бяспекі АС прыпынена. Ён таксама звярнуў увагу на тое, што ў гісторыі Афрыканскага саюза яшчэ не было такога выпадку, калі адпаведныя меры прымяняліся да адразу чатырох дзяржаў-членаў. Летась такія рашэнні былі прыняты ў дачыненні да Буркіна-Фасо, Гвінеі, Малі і Судана. Гаворачы аб Заходняй Афрыцы, Банколе Адэоі назваў серыю пераваротаў, якая адбылася там, крытычным фактарам для рэгіёна і выказаў пажаданне, каб Сахель зноў не стаў «ачагом антыканстытуцыйных змен урадаў». У сваю чаргу старшыня Камісіі АС Муса Факі Махамат указаў на «катастрафічную хвалю» дзяржаўных пераваротаў і адзначыў прычынна-выніковую сувязь з актывізацыяй тэрарызму ў Сахелі. Чаму Афрыку захліснула хваля путчаў?**

### ЗАРАЗЛІВЫ ПРЫКЛАД

З 1960-х гадоў, калі краіны Афрыкі вызваліліся ад каланіяльнай залежнасці, і да канца мінулага стагоддзя ваенныя перавароты на кантыненце здараліся вельмі часта. У 1960-х даследчыкі з амерыканскіх універсітэтаў Цэнтральнай Фларыды і Кентукі налічылі 26 паспяхова ажыццёўленых путчаў і 15 няўдалых мяцяжоў, гэта значыць, усяго 41 спробу сілавога захопу ўлады. У 1970-х адбыліся 42 удалыя і няўдалыя спробы, у 1980-х — 39, 1990-х — таксама 39.

У гэтым тысячагоддзі колькасць пераваротаў і спроб у Афрыцы прыкметна знізілася: 22 адбылося ў 2000-х і 19 — у 2010-х. Краіны кантынента, здавалася, пачалі пераходзіць да больш-менш мірных і дэмакратычных спосабаў змены ўлады, адзначыла «Бі-бі-сі», але шчыльнасць путчаў на адзінку часу зноў рэзка падскочыла. За апошні год у Афрыцы адбылося больш ваенных пераваротаў, чым здаралася ў сярэднім у шасцідзясятыя гады мінулага стагоддзя, калі сілавы захоп улады вайскоўцамі быў на кантыненце амаль штодзённасцю.

Генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш наўпрост канстатаваў, што ў Афрыцы, апроч пандэміі каранавіруса, разгарнулася і «эпідэмія пераваротаў». Усяго за апошнія два гады вайскоўцы захапілі ўладу ў шасці краінах, а яшчэ тры спробы захопу правалілiся. Чатыры перавароты апошняга часу прыпалі на суседнія краіны Заходняй Афрыкі. Дзве з іх — Малі і Буркіна-Фасо — змагаюцца з ісламскімі экстрэмістамі, і путчы, як мяркуюць аналітыкі, былі звязаныя з гэтай барацьбой.

Прэзідэнт Ганы Нана Акуфа-Анда на мінулым тыдні заўважыў, што першы з чарады апошніх пераваротаў, у Малі, стаў для суседніх краін заразлівым дрэнным прыкладам. Пры гэтым большая частка жыхароў заходнеафрыканскіх краін з энтузіязмам паставілася да звяржэння грамадзянскай улады, якую яны лічылі карумпаванай і бездапаможнай у барацьбе з радыкал-ісламістамі, тады як на ўсходзе кантынента, у пераважна мусульманскім Судане, ваенны пераварот у кастрычніку мінулага года, наадварот, быў сустрэты масавымі вулічнымі пратэстамі. Яны былі жорстка задушаны: вайскоўцы забілі дзясяткі дэманстрантаў.

### ДАЎГІ І НАРКОТЫКІ

Апошняя па часе спроба дзяржаўнага перавароту ў Афрыцы адбылася на мінулым тыдні ў Гвінеі-Бісау. Прэзідэнт краіны Умару Сісоку Эмбала заявіў, што ўдалася адбіць «напад на дэмакратыю». Раней паведамлялася, што каля будынка ўрада ў Бісау, дзе праходзіла пазачарговае пасяджэнне кабінета міністраў з удзелам прэзідэнта, пачалася стральба. Мясцовыя рынкі і банкі былі закрыты, на вуліцы горада выехалі аўтамабілі



з вайскоўцамі. Сведкі паведамлялі, што ва ўрадавы комплекс увайшлі ўзброеныя людзі.

Пасля гэтага лідары заходнеафрыканскіх краін у сумеснай заяве асудзілі спробу звяржэння прэзідэнта і заклікалі вайскоўцаў вярнуцца ў казармы. Паведамлялася таксама пра загінулых і пра тое, што салдаты нібыта затрымалі прэзідэнта і міністраў урада. Аднак пазней кіраўнік дзяржавы апублікаваў відэазварот у сваім «Фэйсбуку», дзе заявіў, што пагроза абмінула. «Дзякуй богу, я ў парадку, — таксама напісаў Эмбала ў «Твітэры». — Сітуацыя пад кантролем». У кароткім тэлефонным інтэрв'ю Agence France-Presse прэзідэнт таксама сказаў: «Усё ў парадку».

Па словах Эмбала, некаторыя з тых, хто браў удзел у нападзе, былі арыштаваны. Прэзідэнт паведаміў, што ў час супрацьстаяння загінулі многія супрацоўнікі сілавых структур, аднак не ўдакладніў, колькі менавіта. «Ён удакладніў, што страляніна доўжылася пяць гадзін», — паведаміла выданне Jeune Afrique. Па іроніі лёсу на пасяджэнні кабміна, які быў перапынены ўзброенымі людзьмі, абмяркоўвалася падрыхтоўка да маючага адбыцца саміту Эканамічнай супольнасці заходнеафрыканскіх дзяржаў (ЭКАВАС), на парадку дня якога было пытанне аб тым, як рэагаваць на ваенны пераварот у Буркіна-Фасо, адзін з тых, якія адбыліся за апошні час.

Размешчаная на Захадзе Афрыкі на ўзбярэжжы Атлантычнага акіяна Гвінея-Бісау мяжуе з Сенегалам і Гвінеяй. Гэтая колішняя партугальская калонія лічыцца адной з найбяднейшых краін на планеце. Паводле звестак Сусветнага банка, ВУП на душу насельніцтва складае 1,9 тысячы долараў (14-е месца ў свеце з канца). З 1980-х гэтая дзяржава перажыла ўжо дзевяць пераваротаў і спроб путчаў. Толькі адзін прэзідэнт за ўсю гісторыю краіны з моманту набыцця ёю незалежнасці ў 1974-м здолеў пратрымацца ва ўладзе ўсе належныя па рэгламенце пяць гадоў.

У Гвінеі-Бісау вялізны дзяржаўны доўг, краіна моцна залежыць ад замежнай дапамогі. У дадатак з некаторых часоў Гвінея-Бісау стала перавалачным пунктам для наркотыкаў, якія паступаюць з Лацінскай Амерыкі, так што цяпер яе нават называюць першай афрыканскай наркадзяржавай, паведаміла «Бі-бі-сі». Хваляванні ў краіне, якія, мяркуючы па ўсім, і прывялі да цяперашняй спробы перавароту, пачаліся яшчэ два гады таму, калі вядомы палітык, былы кіраўнік урада краіны Дамінгуш Сімойнш Перэйра і яго ўплывовая Афрыканская партыя незалежнасці Гвінеі-Бісау і Каба-Вэрдэ аспрэчылі вынікі выбараў, якія прысудзілі перамогу Эмбала. Перэйра абвінавачыў прэзідэнта ў незаконным прысваенні ўлады пры падтрымцы ваенных.

Пазней, калі сітуацыя стабілізавалася, прэзідэнт Гвінеі-Бісау заявіў, што спроба мяцяжу магла быць інспіраваная людзьмі, звязанымі з незаконным абаротам наркотыкаў. Дарэчы, Эмбала — і сам колішні вайсковец, адстаўны брыгадны генерал гвінейскай арміі, што абумовіла яму падтрымку з боку часткі вайскоўцаў урадавых войскаў.

### УДАР ПА ІМІДЖЫ

На фоне проста жудаснай беднасці ў многіх афрыканскіх краінах вельмі высокая па сусветных мерках нараджальнасць. Колькасць жыхароў імкліва павялічваецца, насельніцтва маладзее, а ніякіх гарантый жыццёвага дабрабыту няма. Хтосьці з'язджае па лепшую долю ў Еўропу (зноў-такі без усялякіх гарантый трапіць у Стары свет і там замацавацца), але большасць застаецца ў родных краінах, дзе больш-менш прыстойнае жыццё гарантуюць або вайсковая служба ці крымінал, а апошнім часам — яшчэ і тэрарыстычныя групоўкі, якія актыўна асвойваюць рэгіён.

Галоўнай прэтэнзіяй да зрынутага кіраўніка Буркіна-Фасо, дзе вайскоўцы абвясцілі аб захопе ўлады сёлета напрыканцы студзеня, была неналежная арганізацыя барацьбы з джыхадыстамі. У складзе ўзброеных сіл — усяго 11 тысяч вайскоўцаў, за 5-6 гадоў сілы бяспекі страцілі больш чым 500 чалавек. «Насельніцтва рэгіёна ўсё менш верыць у здольнасці дэмакратычных інстытутаў утаймаваць тэрарыстычную пагрозу. А колькасць пераваротаў расце, прытым што значна ўзрастае працэнт іх паспяховага здзяйснення», — заўважыў ng.ru аўтар тэлеграм-канала пра Чорную Афрыку Аляксей Цалуноў.

Нездарма падчас 35-га саміту Афрыканскага саюза за зачыненымі дзвярыма прайшла спецыяльная нарада лідараў краін Чорнага кантынента, якая была прысвечана найактуальнейшай тэме — выпрацоўцы сумесных крокаў для супрацьдзеяння дзяржаўным пераваротам. Супольніцтва, якое аб'ядноўвае 55 дзяржаў кантынента, было заснавана летам 2002-га як правапераемнік Арганізацыі афрыканскага адзінства. Штаб-кватэра АС знаходзіцца ў Адыс-Абебе.

> **«За апошні год у Афрыцы адбылося больш ваенных пераваротаў, чым здаралася ў сярэднім у шасцідзясятыя гады мінулага стагоддзя, калі сілавы захоп улады вайскоўцамі быў на кантыненце амаль штодзённасцю. Генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш наўпрост канстатаваў, што ў Афрыцы, апроч пандэміі каранавіруса, разгарнулася і «эпідэмія пераваротаў».**

Апошнія перавароты на кантыненце нанеслі ўрон іміджу Афрыкі з пункту гледжання пераходу да дэмакратычных рэжымаў. Аб гэтым на саміце лідараў Афрыканскага саюза заявіў Муса Факі Махамат, паведаміла SalamNews. «Неканстытуцыйны захоп улады не з'яўляецца паказчыкам станоўчага іміджу», — адзначыў старшыня камісіі АС. — Нягледзячы на спробы захаваць мір і стабільнасць, на кантыненце апошнім часам пачасціліся перавароты. У прыватнасці, тэракты ў рэгіёне Сахель перашкаджаюць пераходу да дэмакратыі».

Пашырыць парадак дня надзвычайнага саміту па тэрарызме пад эгідай Афрыканскага саюза, які мяркуецца правесці ў маі, тэмай барацьбы з неканстытуцыйнымі пераваротамі на кантыненце прапанаваў прадстаўнік Анголы, паведаміў Jornal de Angola. Міністр замежных спраў гэтай краіны Тэтэ Антоніу заўважыў, што гэта дазволіць выпрацаваць агульную пазіцыю супраць двух бедстваў — тэрарызму і дзяржпераваротаў, якія пагражаюць міру і стабільнасці на кантыненце. У кантэксце апошніх падзей ангольскі чыноўнік заявіў аб неабходнасці прыняцця «больш жорсткіх мер» для прадухілення путчаў і прыцягнення вінаватых да адказнасці.

### КРЫЗІС НА КРЫЗІСЕ

Чарговым старшынёй Афрыканскага саюза тэрмінам на адзін год стаў прэзідэнт Сенегала Макі Саль. Аб гэтым паведаміла прэс-служба панафрыканскай арганізацыі. АС таксама абвясціў склад Асамблеі кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў Афрасаюза на 2022 год. Пасада другога віцэ-старшыні АС замацавана за Лівіяй, трэцяга — за Анголай. Дакладчыкам будзе Дэмакратычная Рэспубліка Конга (ДРК).

Новы старшыня АС нагадаў, што сёлета Афрасаюз адзначае сваё дваццацігоддзе. «Нашы праблемы застаюцца шматлікімі і неадкладнымі, асабліва ў галінах міру і бяспекі, барацьбы з тэрарызмам, абароны навакольнага асяроддзя, аховы здароўя, эканамічнага і сацыяльнага развіцця», — заявіў Макі Саль.

Саль на пасадзе старшыні АС змяніў прэзідэнта Дэмакратычнай Рэспублікі Конга Фелікса Чысекедзі. Дарэчы, апошні экстранна перапыніў сваё знаходжанне ў Адыс-Абебе. Чысекедзі вырашыў неадкладна вярнуцца ў сваю краіну. Напярэдадні стала вядома аб арышце спецыяльнага саветніка прэзідэнта ДР Конга па пытаннях бяспекі Франсуа Беі, які атрымаў мянушку Містар Бяспека. Яго даставілі ва ўстанову Нацыянальнага разведвальнага ўпраўлення ў Кіншасе для допыту. «Ёсць відавочныя сведчанні, якія даказваюць, што высокапастаўленым афіцэрамі была арганізавана змова. Але ўсе службы папярэджаныя і знаходзяцца ў працэсе дэмантажу сеткі змоўшчыкаў», — паведаміла ананімная крыніца ў службе бяспекі ДР Конга.

Магчымасць дзяржаўнага перавароту ў ДРК раней ацаніў колішні сакратар і дыпламатычны саветнік экс-прэзідэнта гэтай краіны Жазэфа Кабілы Кікая Бін Карубі. Па словах былога дыпламатычнага работніка, Дэмакратычная Рэспубліка Конга «не стане выключэннем» у серыі «каскадных пераваротаў», якія скалынаюць Афрыку.

Тым часам стала вядома, што Чорнаму кантыненту спатрэбіцца не менш чым 154 мільярды долараў для рэагавання на крызіс з-за пандэміі каранавіруса. Аб гэтым заявіў днямі ў Адыс-Абебе старшыня Камісіі Афрыканскага саюза Муса Факі Махамат, выступаючы на 40-й сесіі Выканаўчага савета АС. «Уздзеянне пандэміі на эканоміку афрыканскіх краін прывяло да такой рэцэсіі, з якой кантынент сутыкнуўся ўпершыню за некалькі дзесяцігоддзяў. Афрыка ў выніку перажыла падзенне эканамічнай актыўнасці, што пагоршылася ростам інфляцыі і павелічэннем пазыковай нагрузкі. Гэта можа перашкодзіць чаканаму аднаўленню эканомік на кантыненце», — адзначыў Муса Факі Махамат. І гэта адзін з негатыўных фактараў для стварэння палітычнай нестабільнасці, а значыць, перадумоў для прадаўжэння хвалі путчаў.

**Захар БУРАК.**

## Извещение о проведении 24 февраля 2022 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов № 1 (сведения о продаваемом имуществе)* |
|---|
| «Нефтепродукт – обводненное (с примесями) сырье для производства мазута (гудрона)» в количестве 1 000 тонн (ориентировочно), содержащийся в битумохранилище, расположенном по адресу: Минская область, Дзержинский район, г. Фаниполь, АБЗ «Фаниполь» |
| Начальная цена: 100 000,00 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка: 10 000,00 бел. руб. |
| **Предмет торгов № 2 (сведения о продаваемом имуществе)*** |
| «Нефтепродукт – обводненное (с примесями) сырье для производства нефтяных вязких дорожных битумов» в количестве 1 000 тонн (ориентировочно), содержащийся в битумохранилище, расположенном по адресу: Минская область, Минский район, г. Заславль, ул. Заводская, 17/3 |
| Начальная цена: 124 000,00 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка: 12 000,00 бел. руб. |

** Покупатель обязуется своими силами, средствами и за свой счет произвести вскрытие битумохранилища, выемку содержимого (продаваемого имущества) и вывоз с территории производственной базы. Окончательное количество продаваемого имущества определяется по мере выборки нефтепродукта с учетом его контрольного взвешивания.*

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **24 февраля 2022 года в 15.30** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с **14.02.2022 по 22.02.2022 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону (017) 388-43-21.

**Телефоны для справок: (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

## ВНИМАНИЮ АКЦИОНЕРОВ ОАО «БЕЛГОРХИМПРОМ»!

УНП 600024712

**Собрание акционеров состоится 31 марта 2022 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, 17, в актовом зале.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Отчет об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2021 год и основных направлениях деятельности в 2022 году.
2. Отчет ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности общества за 2021 год.
3. Отчет наблюдательного совета общества о проделанной работе в 2021 году.
4. Об утверждении годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2021 год.
5. О распределении прибыли и убытков.
6. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
7. Об определении размеров вознаграждений членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Белгорхимпром».

С материалами собрания акционеры могут ознакомиться по месту нахождения Общества (г. Минск, ул. Киселева, 26а, приемная генерального директора) в рабочие дни в период с 15 по 30 марта 2022 г. с 13.00 до 15.30, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Акционерам, передавшим на основании доверенности свои полномочия на участие в общем собрании членам наблюдательного совета, участие в собрании не обязательно.

Регистрация акционеров (их представителей), имеющих право на участие в собрании, – в день проведения собрания **с 9.00 до 10.30 по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, 17, в актовом зале (3-й этаж).** При себе иметь следующие документы: **акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

### ОРГАНИЗАТОР: НОВОЛУКОМЛЬСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

| Местоположение земельного участка | ЛОТ 1<br>Витебская обл., Чашникский р-н, г. Новолукомль, ул. Кленовая, 1У | ЛОТ 2<br>Витебская обл., Чашникский р-н, г. Новолукомль, ул. Кленовая, 2У |
|---|---|---|
| Целевое назначение | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| Кадастровый номер земельного участка | 225151000001002992 | 225151000001002993 |
| Площадь, га | 0,1426 | 0,1498 |
| Начальная цена объекта аукциона, руб. | 8042,64 | 8448,72 |
| Сумма задатка, руб. | 804,26 | 844,87 |
| Расходы по подготовке и изготовлению документации, руб. | 2475,29 | 2310,48 |
| Условия инженерного развития инфраструктуры | Все объекты на участке необходимо размещать в соответствии с планировочной и инженерно-технической схемами земельного участка с соблюдением санитарных, гигиенических, бытовых, противопожарных норм и правил, прочих действующих нормативно-правовых актов Республики Беларусь | |
| Условия аукциона | **Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:**<br>- в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся:<br>внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке);<br>возместить затраты на организацию и проведение аукциона;<br>- в течение 2 месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола аукциона либо признания аукциона несостоявшимся лицу, единственному участнику несостоявшегося аукциона, выразившему согласие на предоставление ему земельного участка, обратиться за государственной регистрацией права, ограничения (обременения) права на земельный участок в территориальную организацию по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним по месту нахождения земельного участка;<br>- получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта;<br>- приступить к занятию (освоению) земельного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство такого капитального строения (здания, сооружения) | |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462, и состоится при наличии не менее двух участников.

